❑ *Банкаўскую дзейнасць чакаюць перамены. Прыняты адпаведны ўказ Прэзідэнта Беларусі.*

❑ *Ваенны пілот цаной свайго жыцця выратаваў вёску. Паведамляем падрабязнасці начной трагедыі.*

1-я стар.

❑ *«Безгаспадарчая» зброя выстраліць абавязкова...*

2-я стар.

❑ *Ламаносавы растуць і ў глыбінцы. Не загубіць бы іх талент.*

2-я стар.

ЗВЯЗДА

29 мая 1996 г. серада, № 133 (22936)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

ВОЗГАЛАС

Працоўнаму калектыву Мінскага трактарнага завода імя У. І. Леніна

ДАРАГІЯ ТРАКТАРАБУДАЎНІКІ!

Сардэчна віншую ардэнаносны працоўны калектыў Мінскага трактарнага завода імя У. І. Леніна, усіх работнікаў вытворчага аб'яднання «Мінскі трактарны завод» з юбілеем — 50-годдзем з дня заснавання галаўнога завода.

Амаль паўстагоддзя аддзяляюць нас ад таго часу, калі з канвеера прадпрыемства сышлі першыя айчынныя трактары. Дзякуючы добрасумленнай працы пакаленняў трактаразводцаў, рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, беларускія трактары заваявалі аўтарытэт сярод работнікаў сельскай гаспадаркі нашай рэспублікі і іншых краін свету. Вашы трактары можна сустрэць на палях больш за 85 краін планеты.

Мінскі трактарны завод па праву заняў вядучае месца сярод прадпрыемстваў Беларусі. За мінулы перыяд вамі асвоены дзесяткі арыгінальных мадэляў машын для сельскай гаспадаркі, выпушчана больш за 3 мільёны універсальна-акучвальных трактароў. На іх базе створана і серыйна выпускаецца тэхніка самага рознага народнагаспадарчага прызначэння. Працоўцы прадпрыемства адзначана многімі медалямі і ганаровымі дыпломамі на міжнародных выстаўках і кірмашах, а працоўны калектыў узнагароджаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі.

І сёння, у складаных умовах эканамічных перавтварэнняў, вы не апусцілі рукі, настойліва шукаеце шляхі павышэння канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі. Выказваю цвёрдую ўпэўненасць у тым, што вы паспяхова пераадолееце цяжкасці пераходнага перыяду.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і новых поспехаў у працы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. ЛУКАШЭНКА.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Лётчык Уладзімір Карват выратаваў вёску цаной уласнага жыцця

Як ужо паведамляла «Звязда», 23 мая познім вечарам падчас выканання начных палётаў, на аэрадроме Баранавічы разбіўся ваенны самалёт. Лётчык загінуў. Сталі вядомы некаторыя падрабязнасці.

У гэты вечар лётчык першага класа падпалкоўнік Уладзімір Карват выконваў практыкаванні на баявой машыне Су-27 П. Гэта быў другі вылет самалёта за дзень. Праз нейкі час пасля вылету кіраўнік палётаў атрымаў ад пілота трывожнае паведамленне: малы ціск у гідрасістэме рулявога кіравання. Кіраўнік палётаў адразу ж аддаў загад лётчыку спыніць выкананне пастаўленай задачы і вярнуцца на базу. Праз 29 секунд пасля гэтага Карват выйшаў на сувязь і паведаміў, што ціск у гідрасістэме стабілізаваўся. Аднак загад вярнуцца быў паўтораны яшчэ раз. Калі ўсе з палёгкай уздыхнулі, маўляў, дзякуй Богу, на гэты раз усё абышлося, зноў на сувязь выйшаў Уладзімір: самалёт страціў кіраванне. Хутка машыну стала «кідаць», яна загаралася... На нізкай вышыні самалёт прайшоў над вёскамі Малое Гоцішча, Заполле і рухнуў на зямлю. Машына ўзарвалася разам з пілотам.

Чаму ж пілот не катапультаваўся (загад пакінуць некіруемую машыну яму быў аддадзены)? Хутчэй за ўсё, не паспеў. Камісія, якая праводзіць расследаванне, схільная лічыць, што падпалкоўнік Уладзімір Карват да апошняга моманту намагаўся прымусіць машыну «слухацца». Калі надзеі на гэта ўжо не засталося (самалёт загарэўся), пілот пачаў адводзіць палаючую машыну як мага далей ад начных агнёў населеных пунктаў.

У чым прычыны аварыі? Беспадстаўныя абвінавачанні пілота ў непрафесіяналізме — спецыяльная камісія ўсе дзеянні Карвата прызнала правільнымі. Ды і як можна абвінавачваць у непрафесіяналізме начальніка паветрана-агнявой і тактычнай падрыхтоўкі, пілота першага класа, які з 1977 года ў войску, а ў паветры правёў 1226 гадзін? Пілота больш вопытнага знайсці цяжка. Самалёт новы і на момант вылету быў спраўны. Хутчэй за ўсё, мела месца адна з тых самых недарэчных выпадковасцей... Канчатковыя вынікі можна будзе падвесці пасля расшыфроўкі двух «чорнай скрынкі», балазе, яна захавалася.

Падпалкоўнік Карват загінуў па-геройску. Было яму ўсяго 37 гадоў. Без мужа засталася жонка, без бацькі — дзеці. Жыхары выратаваній вёскі сабралі грошы на пахаванне пілота. Акрамя гэтага яны звярнуліся ў райсавет з просьбай назваць іх населены пункт імем героя.

Сяргей ПРОТАС.

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 209

АБ МЕРАХ ПА РЭГУЛЯВАННЮ БАНКАЎСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

У мэтах забеспячэння эканамічнай стабільнасці, умацавання грашова-крэдытнай сістэмы, абароны правоў грамадзян, інтарэсаў крэдыторaў і ўкладчыкаў і ўлічваючы недахопы заканадаўчага рэгулявання банкаўскай дзейнасці, пагаршэнне крымінагеннай сітуацыі ў крэдытнай і валютнай сферах, парушэнні заканадаўства пры стварэнні камерцыйных банкаў **пастанаўляю:**

1. Устанавіць, што:

1.1. Аплата працы і матэрыяльнае стымуляванне работнікаў банкаў, іншыя сацыяльныя выплаты ім ажыццяўляюцца ў межах, устаноўленых Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Адзінай тарыфнай сеткай работнікаў Рэспублікі Беларусь і іншымі нарматыўнымі актамі.

У выпадку стратнай дзейнасці банка аплата працы яго работнікаў праводзіцца ў адпаведнасці з Адзінай тарыфнай сеткай работнікаў Рэспублікі Беларусь без надбавак (даплат) да службовых акладаў, прэмій і іншых дадатковых выплат, што ажыццяўляюцца за кошт расходаў банка і фонду эканамічнага стымулявання;

1.2. Расходы банкаў на будаўніцтва будынкаў і збудаванняў, набыццё абсталявання, тэхнічных і транспартных сродкаў, іншых асноўных фондаў ажыццяўляюцца толькі за кошт прыбытку, які застаецца ў іх распараджэнні пасля выплаты ўсіх падаткаў, збораў і іншых абавязковых плацяжоў у бюджэт і дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды (чыстага прыбытку).

Прыраўнаваць указаныя расходы, калі яны зроблены не за кошт чыстага прыбытку, да ўтоенага прыбытку, прадугледзеўшы прыцягненне вінаватых да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.3. Паручыцельства і гарантыя па крэдытных дагаворах павінны забяспечвацца залогам маёмасці гаранта або паручыцеля;

1.4. Страты банкаў пакрываюцца за кошт сродкаў фонду эканамічнага стымулявання;

1.5. Банкі абавязаны паведамляць Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь аб кожным крэдыце, які перавышае ў суме 10 тыс. долараў ЗША, і аб выкананні абавязацельстваў па адпаведнаму дагавору;

1.6. Стварэнне і спыненне дзейнасці філіялаў банкаў ажыццяўляюцца толькі з пісьмовай згоды Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь;

1.7. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь мае права:

уводзіць часовае кіраванне банкам і прымаць іншыя меры ў мэтах стабілізацыі яго фінансавага становішча ў выпадку ўстойлівай стратнасці банка больш чым тры месяцы запар, неплацежаздольнасці або пагрозы неплацежаздольнасці і банкрутства банка;

накладаць штраф у памеры ад 50 да 200 мінімальных заработных плат на службовых асоб банка, вінаватых у налічэнні і (або) датэрміновай выплаце працэнтаў па дэпазітах (укладах) юрыдычных і фізічных асоб, а таксама выплаце павышаных працэнтаў работнікам банка.

2. Кабінету Міністраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь, Пракуратуры да 15 чэрвеня 1996 г. завяршыць праверку законнасці адчужэння дзяржаўнай маёмасці камерцыйным банкам, утвораным на базе ўстаноў Прамбудбанка СССР, Агрупрамбанка СССР і Жылсацбанка СССР, і прыняць меры па кампенсацыі нанесенага Рэспубліцы Беларусь урону.

3. Кабінету Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь:

3.1. Вызначыць рэальную долю дзяржавы і юрыдычных асоб, заснаваных на дзяржаўнай уласнасці, у статутных фондах банкаў, зыходзячы з росту курса долара ЗША з дня ўнясення дзяржаўнай уласнасці ў статутны фонд.

Камерцыйныя банкі, у статутныя фонды якіх рабіліся такія ўклады, абавязаны ў двухмесячны тэрмін:

устанавіць памеры статутных фондаў і долі акцыянераў у статутным фондзе ў адпаведнасці з рэальнай доляй дзяржавы і юрыдычных асоб,

заснаваных на дзяржаўнай уласнасці, вызначанай у адпаведнасці з часткай першай гэтага падпункта;

падаць неабходныя дакументы для дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і дапаўненняў ва ўстаноўчыя дакументы банкаў і рэгістрацыі іх акцый. Рэгістрацыя праводзіцца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і Інспекцыяй па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў без спагнання адпаведных збораў;

3.2. Зацвердзіць пералік банкаў, упаўнаважаных абслугоўваць дзяржаўныя праграмы, а таксама адкрываць рахункі дзяржаўным органам і юрыдычным асобам, заснаваным на дзяржаўнай уласнасці;

сумесна з міністэрствамі, іншымі цэнтральнымі органамі кіравання і мясцовымі выканаўчымі камітэтамі да 1 кастрычніка 1996 г. прыняць меры па павелічэнню долі дзяржавы і юрыдычных асоб, заснаваных на дзяржаўнай уласнасці, у статутных фондах гэтых банкаў;

забяспечыць сваё прадстаўніцтва ў вышэйшых органах кіравання названых банкаў, прадаставіўшы прадстаўнікам права прыняць рашэнні іншых вышэйшых органаў кіравання да вырашэння рознагалосся агульным сходам акцыянераў, калі такія рашэнні могуць нанесці матэрыяльны ўрон банку ці дзяржаве;

3.3. Паскорыць стварэнне Галоўнага дзяржаўнага казначэйства Міністэрства фінансаў і падрыхтоўку палажэння аб ім.

4. Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь:

4.1. Да 1 верасня 1996 г. правесці:

перарэгістрацыю банкаў у мэтах прывядзення іх дзейнасці ў адпаведнасць з гэтым Указам;

пераатэстацыю кіраўнікоў і галоўных бухгалтараў банкаў і іх філіялаў, а таксама забяспечыць павышэнне кваліфікацыі кадраў, занятых у банкаўскай сферы;

4.2 У праекце Банкаўскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, прадугледзець нормы, якія б забяспечвалі абарону ўкладаў у выглядзе маёмасці грамадзян ці дзяржавы ў статутныя фонды банкаў;

4.3. У двухмесячны тэрмін арганізаваць з выкарыстаннем Дзяржаўнага рэестра падаткаплацельшчыкаў Рэспублікі Беларусь камп'ютэрны ўлік непагашаных пазык з указаннем пазыкаатрымальнікаў, прадастаўляючы банкам і іншым крэдытным установам права доступу да даных уліку на падставе афіцыйных дазволаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

5. Камерцыйным банкам у месячны тэрмін прадставіць Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь план мерапрыемстваў па фінансаваму аздараўленню, ліквідацыі прычын стратнасці банкаў, і ў першую чаргу за кошт скарачэння непрадукцыйных расходаў, расходаў на аплату працы і матэрыяльнае стымуляванне работнікаў.

6. Гэты Указ увесці ў дзеянне з дня яго апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.ЛУКАШЭНКА.

24 мая 1996 г.
г.Мінск.

АФІЦЫЙНА

ПРЭЗІДЭНТ АДПРАВІЎСЯ Ў СОЧЫ АДПАЧЫЦЬ І ПАПРАЦАВАЦЬ

Увесь гэты тыдзень Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правядзе ў Сочы. Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, ён адправіўся туды ў нядзелю, каб прайсці загадзя запланаваны кароткі аднаўленчы курс. Аднак гэтыя дні Прэзідэнт прысвеціць не толькі адпачынку. Ён мае намер правесці на Чарнаморскім узбярэжжы шэраг сустрэч з расійскімі кіраўнікамі і палітыкамі, абмеркаваць з імі праблемы паглыблення беларуска-расійскай інтэграцыі. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка прадоўжыць у Сочы работу над праектам канцэпцыі эканамічнай і фінансавай стабілізацыі ў краіне.

БЕЛТА.

НАЗНАЧЭННІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў указы аб новых назначэннях.

Харлап Анатоль Дзмітрыевіч назначаны міністрам прамысловасці. Яму прысвоены першы клас служачага дзяржаўнага апарату.

Грошаў Віктар Іванавіч назначаны першым намеснікам міністра спорту і турызму. Яму прысвоены першы клас служачага дзяржаўнага апарату.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь палкоўнік Дырман Іван Васільевіч назначаны начальнікам штаба ўзбраення — першым намеснікам начальніка ўзбраення Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь палкоўнік Басавец Валерый Аляксандравіч назначаны намеснікам міністра абароны па тылу — начальнікам тылу Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Ён вызвалены ад пасады начальніка штаба тылу — першага намесніка начальніка тылу Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

БЕЛТА.

ВІЗІТ С.ШАРЭЦКАГА Ў ЗША ЗАВЕРШАНЫ

Завяршыўся рабочы візіт Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Сямёна Шарэцкага ў ЗША.

Як паведаміла прэс-служба парламента, на працягу 9 дзён адбылося каля 20 сустрэч з афіцыйнымі прадстаўнікамі кангрэса, дзяржаўнага дэпартамента, Савета бяспекі, Міністэрства абароны Злучаных Штатаў.

Аб выніках візіту Старшыня Вярхоўнага Савета раскажа на прэс-канферэнцыі, якая адбудзецца 31 мая пасля вяртання С.Шарэцкага з пасяджэння Міжпарламенцкай асамблеі, што праходзіць у гэтыя дні ў Бішкеку.

БЕЛТА.

У КАМІСІЯХ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА

Камісія па міжнародных справах прыйшла да выраду аб неадпаведнасці некаторых палажэнняў Дагавора аб супрацоўніцтве ў ахове граніц дзяржаў—удзельніц СНД з краінамі, якія не ўваходзяць у Садружнасць, нацыянальнаму заканадаўству. Члены камісіі на сваім пасяджэнні вырашылі не выносіць яго на ратыфікацыю без дадатковай апрацоўкі. Разам з тым яны будуць рэкамендаваць Вярхоўнаму Савету адобрыць Пагадненне паміж Беларуссю і Расійскай Федэрацыяй, што адносіцца да пытанняў юрысдыкцыі і ўзаемнай прававой дапамогі па справах, звязаных з часовым знаходжаннем расійскіх воінскіх фарміраванняў з саставу стратэгічных сіл на тэрыторыі Беларусі, але з некаторымі агаворкамі.

Прэс-служба Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь — БЕЛТА.

МАНТСЕРАТ КАБАЛЬЕ — У МІНСКУ

«Вашы людзі натуральныя, несапсаваныя», — падзялілася сваімі ўражаннямі ад Беларусі вялікая спявачка.

Учора ў Мінску адбыўся адзіны канцэрт Мантсерат Кабалье.

У ГРОДНЕ ПРАЙШОЎ ПЕРШЫ РЭСПУБЛІКАНСКІ ФЕСТЫВАЛЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

ГЭТА МЫ — НАРОД БЕЛАРУСІ!

Як кажуць журналісты: «Дзе фэст — там і я ест». Такая ўжо работа ў нас: прысутнічаць, усё бачыць, аналізаваць, расказваць пра падзею. Каб тысячы людзей, прачытаўшы твой матэрыял, адчулі, што там адбывалася. Ну дык вось, чарговы фэст, куды я вас запрашаю, — рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Апошнім часам у Беларусі столькі праводзіцца ўсялякіх культурных мерапрыемстваў, што нам магла б пазайздросціць любая краіна. Толькі ў маі ўжо адбыліся: фестываль камернай музыкі ў Нясвіжы, Міжнародны пленэр імя Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве, свята ўшанавання беларускай інтэлігенцыі ў Віцебску, фестываль ў Мінску «Музыка і тэатр», фестываль народнай музыкі ў Баранавічах, міжнародны кінафестываль «Залаты віцязь»...

Ужо адзін гэты пералік, даволі няпоўны, можа стварыць ураканне, што ў Беларусі адбываецца своеасаблівы Рэнесанс культуры і спрыяе ўсяму гэтаму дабратворны мікраклімат у краіне. Але парадаксальнасць сітуацыі якраз у тым і заключаецца, што культура Беларусі перажывае цяпер даволі складаныя часы: з-за недахвату сродкаў закрываюцца вясковыя бібліятэкі, згортваецца дзейнасць нацыянальнай кінастудыі, катастрафічна падаюць тыражы беларускіх выданняў, вымушаны мяняць прафесію музыканты і артысты, чые заробкі не даюць магчымасці выжыць... Вядома ж, шматлікія культурныя фэсты ў такой складаным палітычнай і сацыяльнай сітуацыі, як у нас у Беларусі, успрымаюцца ў грамадстве даволі неадназначна. Як самімі дзеячамі культуры, так і звычайнымі абывацелямі. Маўляў, ці да святаў нам, калі па некалькі месяцаў не атрымліваеш зарплату, а не сёння дык заўтра можаш увогуле аказацца без работы...

Са складанымі пачуццямі адправілася і я на фестываль у Гродна.

Больш за 600 чалавек — удзельнікаў і гасцей прыбыло сюды 24 мая. Дэлегацыю кожнай нацыянальнай меншасці афіцыйна прадстаўлялі 25 чалавек. Акрамя гэтага — артысты, дыпламаты, дзяржаўныя дзеячы. Увесь горад ператварыўся ў суцэльную канцэртную пляцоўку...

На прэс-канферэнцыі, якая папярэднічала адкрыццю фестываля, намеснік міністра культуры У. Рылатка адзначыў, што ідэя падобнага фестывалю — жыватворная і актуальная для Беларусі, дзе спрадвеку пражывалі ў згодзе мноства розных народаў: беларусы, палякі, рускія, украінцы, татары, літоўцы, яўрэі. Усе яны — гэта і ёсць народ сучаснай Беларусі.

Сапраўды, калі ў Беларусі будзе праводзіцца пераліс, мы зможам яшчэ раз пераканацца, які разнастайны этнічны букет мы маем у сваёй краіне: за апошнія два стагоддзі, і асабліва ў апошні час, сям'я беларускага народа значна папоўнілася немцамі, французамі, карэйцамі, азербайджанцамі, армянамі, в'етнамцамі, арабамі... Кожны з гэтых народаў апынуўся ў Беларусі па розных прычынах. Немцы, напрыклад, прыязджалі па ўласнай ініцыятыве ў пошуках «лепшай долі» і па запрашэнню мясцовых уладаў, якія бачылі ў іх дзелавых і надзейных партнёраў. Вялікі князь Гедымін, прынамсі, для работы ў Вялікім княстве Літоўскім запрашаў рамеснікаў з ганзейскіх гарадоў Любека і Брэмена. В'етнамцы і карэйцы прыязджалі да нас вучыцца ў часы існавання СССР... Многія аселі на беларускай зямлі, абзавяліся сем'ямі і адчуваюць сябе даволі камфортна сярод беларусаў. Дарэчы, толькі ў апошнее дзесяцігоддзе, калі стала развальвацца сацыялістычная сістэма, многія народы ў Беларусі гучна заявілі пра сваё існаванне. Яны пачалі гуртавацца, ствараць свае культурныя суполкі, аб'яднанні і абшчыны.

У 1994 годзе з мэтай рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы адраджэння, захавання і развіцця нацыянальных культур у Беларусі быў створаны Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. Ён аб'яднаў 12 рэспубліканскіх і мясцовых нацыянальных культурных згуртаванняў. А ў 1995 годзе пры Кабінеце Міністраў рэспублікі стаў функцыянаваць Каардынацыйны савет па справах нацыянальных меншасцей, які ўзначаліў віцэ-прэм'ер У. Русакевіч. Гэта грамадская арганізацыя, куды ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх нацыянальных аб'яднанняў, міністры, адказныя работнікі дзяржапарату.

Прысутны на прэс-канферэнцыі з нагоды адкрыцця фестывалю нацыянальных культур адказны сакратар Каардынацыйнага камітэта спадар Аляксандр Білык сказаў, што такую вялікую ўвагу ў Беларусі сталі надаваць нацыянальным меншасцям не таму, што сітуацыя вострая, а таму, каб яна не абвастрылася, як гэта адбылося ў многіх іншых краінах. Правы нацыянальных меншасцей, як сказаў сп. Білык, ва ўсім свеце займаюць адно з першых месцаў у пераліку грамадзянскіх правоў. Як мы ведаем, у многіх былых рэспубліках СССР нашы суайчыннікі — беларусы на сабе зведалі, што такое лічыцца нацыянальнай меншасцю, быць пазбаўленымі элементарнага права — мець грамадзянства. Маёй суседкай у гатэлі аказалася Тацяна Кавалёва, старшыня беларускай суполкі «Суродзіч» у далёкім Якуцку. Яна расказала мне, як цяжка даводзіцца беларусам у Якуціі (Рэспубліка Саха), якія пражылі там па 25—35 гадоў, а цяпер аказаліся людзьмі другога гатунку.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ВЫРАТАВАННЕ

Увага! Сумесная акцыя газеты «Звязда» і Беларускага дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля»

За адзін дзень «Звязда» як водгук на наш зварот заявіць аб сабе ўсім, чые дзеці хворыя і маюць неабходнасць у аздараўленні, атрымала ад сваіх чытачоў і падпісчыкаў 8 лістоў. Вось адрасы нашых карэспандэнтаў: в. Дзятлавічы Лунінецкага, в. Леніна Добрушскага, в. Міхалькі Гомельскага раёнаў, г. Маларыта, два лісты — з Лельчыц. У кожным з пісьмаў — канцэнтраваны боль за некалькі апошніх гадоў. Нягледзячы на яўныя пакуты, на многія і многія перажыванні, жанчыны (ізноў усё на плечы жанчыны!) пішуць стрымана, лаканічна. Але за лістамі, нягледзячы на ўсю іх стрыманасць, відавочны боль, відавочныя слёзы. Усе лісты перададзены старшыні Беларускага дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля» Генадзю Грушавому з просьбай пракаменціраваць кожны зварот. Адказ будзе надрукаваны ў «Звяздзе» літаральна днямі.

Сёння мы змяшчаем у газеце адзін з лістоў. Каменціраваць нешта не падымаецца рука. Людзі ж гавораць дастаткова, роўна столькі, колькі можна сказаць. Паслухайце самі. Прачытайце самі. Угледзьцеся ў чужую душу. Упэўнены, што забаліць і вам.

З ліста Тэрэзы Іванаўны Сліжык (г. Валожын):

«... Піша вам мнагадзетная маці, а дакладней — маці пяцярых дзяцей... Каля двух гадоў мне таксама абяцалі ў РАНА, што маіх старэйшых дзяцей возьмуць на аздараўленне. Але сёлета новы загадчык коратка і ясна сказаў, што нічым дапамагчы не зможа, паколькі дзеці з нашай СШ № 3 (гімназіі) нікуды не паедуць. Але паедуць з № 1 і № 2. А чаму б нас туды не падключыць? Але ён спаслаўся на тое, што як быццам гэтага вырашыць ён не зможа. Але хто можа — я таксама ў яго не даведалася.

У іншыя школы прыходзіць гуманітарная дапамога. А ў нас адзін раз была, ды якраз мае дзеці не пайшлі ў той дзень на заняткі. Значыць нічога і не дасталося. А ў раён жа ўвогуле фуры з дапамогаю прыходзяць. Толькі дзе тая дапамога знікае — ніхто не ведае. Я асабіста не змагла нечага дабіцца, каб яе атрымаць.

Адзін раз ездзіла ў асацыяцыю мнагадзетных бацькоў, але там якраз не было з чаго выбраць. І усё ж дзякуй. Там аднесліся з разуменнем. Але ж якраз нашых памераў аказалася мала. Можа, калі-небудзь яны змогуць дапамагчы. Ды толькі гэта далёка. Білет каштуе грошай.

Так, я забылася расказаць пра сваю няпоўную сям'ю. З мужам мы разышліся ў 1993 годзе. Зразумела — з-за яго п'янак. Але ж пазбавіцца ад яго нам не ўдалося. Хіба што паменела скандалаў. Баіцца, каб яго не выселілі з кватэры. Вось так і жывём у трохпакаёўцы. Калі не п'е, то дапаможа што-небудзь і на агародзе, і па хаце. А калі запой пачынаецца, то пляваць ён хацеў на ўсё.

Дзеці: Саша і Наташа — 31.05.82 г. нар., Маша — 22.07.92 г. нар., Ваня і Вова — 27.11.93 г. нар. Як бачыце, выхоўваю 2 пары двайнят. Хто гадаваў — таму тлумачыць не трэба, што гэта такое. Дапамагаюць, вядома ж, старэйшыя вельмі здорава мне. А так, мусіць, не здолела б выжыць... Вельмі хацелася б, каб хоць раз куды-небудзь яны з'ездзілі. Каб адпачылі, набраліся сіл, як фізічных, так і маральных. Дзеці добрыя. І не таму, што мае. Пакуль што нічога. Але жыццё, вядома, не з лепшых. Дачцэ падабаюцца замежныя мовы, нядрэнна ў яе як быццам ідуць англійская і нямецкая. А сын вывучае англійскую і польскую. Але, на вялікі жаль, жадання майго мала, каб іх адправіць некуды ў паездку.

Прыбытак мой зусім маленькі. 650 тысяч рублёў атрымліваю на дзяцей. 413 тысяч — аліменты ад мужа. Вось і ўсё. Як падумаю, што трэба апрануць, абуць, за траіх за садзік заплаціць, дык ад думак тых нядобра робіцца. А дзеці ж і есці хочуць. Толькі дзяржава вырашыла, што на 40 тысяч немаўля можна накарміць.

Зімою ў лік квартплаты выдзяляюць субсідыі. А ў гэтым месяцы трэба заплаціць 92 тысячы рублёў. Дзе іх узяць? На чалавека ў нас атрымаўся прыбытак, роўны 156 тысячам. Субсідыі выдаюць, калі прыбытак не перавышае 126 тысяч рублёў... Гэта — здзек на дзецьмі. Інакш хіба можна сказаць?

Пісьмо маё атрымалася не вельмі, але, відаць, жыццё такое. Якое жыццё — такое і пісьмо. Хацелася б, каб у маіх дзяцей жыццё атрымалася лепшым...»

Паважаная Тэрэза Іванаўна, і «Звязда» жадае вам лепшай долі. Спадзяёмся, што БДФ «Дзецям Чарнобыля» дапаможа вам ці не ў першую чаргу. Верым, што ў хуткім часе вы напішаце нам і раскажаце пра падтрымку.

І яшчэ. Газета «Звязда», баючыся, што гэтыя радкі так проста могуць і не заўважыць у Валожынскім РАНА, адпраўляе яго загадчыку ліст з рэдакцыі. Магчыма, і кіраўнікі народнай асветы Валожыншчыны знойдуць шанц дапамагчы вам і вашым дзецям.

Дарагія сябры! Дарагія чытачы! «Звязда» і Беларускі дабрачынны фонд «Дзецям Чарнобыля» распачалі сумесную акцыю па выяўленню і адпраўцы на аздараўленне за мяжу дзяцей, у першую чаргу з глыбінкі, якія атрымалі захворванні ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС і зусім альбо ў апошнія годдва не прайшлі лячэння.

Пішыце на адрасы: 220029, г. Мінск, вул. Старавіленская, д. 14, Беларускі дабрачынны фонд «Дзецям Чарнобыля» альбо 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, д. 10а, «Звязда». Званіце па тэл.: 68-26-72, 32-14-52.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

КАБ З ГЭТАЙ ЗЯМЛЁЮ І З ГЭТАЮ ВЕРАЮ ЗАСТАЎСЯ ЗАЎЖДЫ ЧАЛАВЕК

Мой суразмоўца — сівенькі дзядуля — яшчэ раз угледзеўся ў прамытую майскім дажджом далячынь і, нібы падводзячы рысу, сказаў: «Вось тут няхай і пахаваюць мяне... няхай будзе так...»

З вышыні пагорка бачны палявыя сцяжыны, па якіх людзі сыходзіліся да царквы. З вышыні пагорка ўдалячынь плыў голас званоў.

Нібы цэлая вечнасць мінула з тых ліхіх дзён, калі ў гэтых мясцінах была ўшчэнт эрыйнавана капліца ў імя Праабражэння Гасподняга. Так тады намагаліся знішчыць у чалавечых сэрцах спрадвечную нашу веру ў Госпада.

Але, як гаворыць святое Пісанне, імя Госпада знішчыць немагчыма, як немагчыма высечы ў нашых душах парасткі любові і дабрыні.

Усім светам збіралі мясцовыя людзі сродкі на новы храм. У гэту скарбонку клаліся і апошнія рублі збяднелых, і важкія сумы багатых ахвяравальнікаў. Акцыянернае таварыства «Забудова» зрабіла ўсё, каб новы праваслаўны храм узняўся на гэтым пагорку як сімвал сённяшняга агульнага пакаяння і нашай агульнай адвечнай еднасці.

На асвячэнне новай царквы сышліся жыхары блізкіх вёсак, прадстаўнікі кіраўніцтва раёна, вобласці. Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі правёў урачыстую літургію.

Новы храмавы комплекс каля пасёлка Чысць — прыклад таго, як трэба адраджаць нашы агульныя каштоўнасці, зняважаныя за гады гвалтоўнага атэізму. Побач з царквою адвялі зямлю пад вясковыя могілкі, таксама абнесеныя прыгожай агароджаю, з брамаю, невялічкім будынкам для рытуальных патрэб.

Мы ўсе ўжо прызвычаіліся, што жорсткая рэчаіснасць прымушае чалавека забывацца на родны кут, шукаць па свеце месца сабе і сваёй сям'і.

Радасна і да слёз балюча ўспрымаць нэпаўголас сказаныя словы старога, які ўсё ж такі дажыў да сённяшняга свята адраджэння храма: «Вось тут і пахавайце мяне...»

Сціплую самаробную шыльдачку з такімі ж словамі ўбачыў аб'ектыў фотаапарата сярод усіх урачыстых падзей каля новай царквы.

Яўген ПЯСЕЦКІ (пасёлак Чысць, Маладзечанскі раён).

Фота аўтара і Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

РАКЕТА Ў КАНАПЕ

Некаторыя расійскія палітыкі здзіўляюцца: адкуль у прыхільнікаў Д. Дудаева ўзялося столькі зброі? Дэпутаты Думы праводзяць па гэтаму пытанню дыскусіі, а ваенныя разводзяць рукамі. Ніхто не ведае.

Але Чачня далёка і там склалася свая, спецыфічная сітуацыя — ідзе вайна.

ІНШАЯ СПРАВА БЕЛАРУСЬ. Тут усё спакойна і здавалася б, што безгаспадарчай зброі ў нас не павінна быць. Усё ўлічана і знаходзіцца пад строгім кантролем. На жаль, гэта не так.

Пра тое, што ў падвале аднаго з дамоў у Баранавічах знайшлі ракеты, кароткая інфармацыя была. І вось цяпер у нас ёсць магчымасць расказаць больш падрабязна пра гэтыя самыя ракеты. Хаця крымінальная справа і накіравана на даследаванне, але па сутнасці яно нічога новага не скажа. А пакуль апошняя кропка не пастаўлена, то не будзем упамінаць прозвішчы вінаватых, тым больш што віна іх не самая вялікая. Тыя, хто павінен быў бы панесці найбольшае пакаранне, выяўлены, відавочна, ніколі не будуць.

23 лістапада мінулага года нарад міліцыі хацеў затрымаць збытчыка наркотыкаў. Хаця міліцыянеры прыйшлі на кватэру ў шэсць гадзін раніцы, але падазраваемы паспеў уцячы, праўда, пакет з наркотыкамі пакінуў. Зрабілі вобыск. Паднялі канапу, а там ракета. Ляжыць на ўсю даўжыню, ад падлакотніка да падлакотніка. Выклікалі са Слоніма сапёраў, якія ўстанавілі, што ракета баявая і можа прымяняцца па назначэнню. Ды і змазка сведчыла, што ракета «новенькая». У кватэры жыла жанчына з двума сынамі, і адзін з іх, Н., сказаў, што ён гэтую штуку ўзяў, «каб паглядзець, што гэта такое».

Яго і арыштавалі. Напачатку Н. упарціўся і не хацеў гаварыць, дзе ўзяў ракету, але, убачыўшы, што справа прымае сур'ёзны накірунак, захацеў сустрэцца са следчым, якому і расказаў, што ракету ўзяў у свайго знаёмага Л., які пражывае па вул. Тельмана, 177. Па гэтаму адрасу адразу ж выехала аператыўная група. Вобыск кватэры нічога не даў, але затое калі адчынілі дзверы падвала, то перад вачыма операў паўстаў штабель ракет. Складзеныя як дровы, адна на адну, яны ўражвалі. Налічылі дзевятнаццаць штук.

Цяпер паглядзім, што ўяўляюць сабой гэтыя ракеты? Дамо магчымасць чытачам самім асэнсаваць усю сітуацыю, яе сур'ёзнасць.

Ракеты С-8 і С-8 «КАМ» (кумулятыўна-асколачная, мадэрнізаваная) устанаўліваюцца на самалётах СУ-29 і верталётах. Клас — «паветра—зямля». Прымяняюцца для нанясення ўдару па жывой сіле пацыўніка, а таксама і па браніраваных аб'ектах. Даўжыня ракеты 175 см, адлегласць палёту — 55 км. Хачу тут спыніцца на адной акалічнасці. Гэтыя ракеты могуць шырока выкарыстоўвацца і як «зямля-зямля». Дастаткова такую ракету пакласці на рэйку, у трубу, даць ёй адпаведны накірунак, нахіл — і ракета спрацуе па прынцыпу «кацюшы». А для запуску патрэбна толькі батарэйка ад кішэннага ліхтарыка. Фактычна, з такой ракетай можа справіцца любы чалавек. У Чачні баевікі шырока выкарыстоўваюць гэтыя ракеты для абстрэлу федэральных войскаў. Якія ў сваю чаргу з самалётаў ды верталётаў такімі ж ракетамі наносяць удары па чачэнскаму боку.

Выклікалі спецыялістаў. Начальнік службы ўзбраення вайсковай часці і камандзір групы размініравання аднаго з батальёнаў устанавілі, што ракеты баявыя. Зноў жа ракеты былі змазаныя, а кожны вінцік на іх паверхні апячатаны. Разабраць ракету ў бытавых умовах немагчыма. Пры гэтым кожная ракета павінна была знаходзіцца ў асобнай скрынцы, інакш неасцярожны ўдар мог прывесці да выбуху.

На допыце Л. заявіў, што ракеты яму на захоўванне прывёз знаёмы В., які да гэтага трымаў іх у сваім гаражы. На гэтым следства практычна і закончылася, зайшло ў тупік, бо грамадзянін В. пакончыў жыццё самагубствам — павесіўся. Тут усе нітачкі і абарваліся.

Цяпер знайсці хоць нейкія канцы цяжка, тым больш, што ні адна вайсковая часць на тэрыторыі Беларусі не заявіла, што ў яе прапалі авіяракеты.

Тут хачу выказацца іранічна. Губляе наш народ класавую пільнасць. Добра, каля гаража людзей нямога, там можна было ракеты непрыметна разгрузіць і загрузіць, але перавезці і схаваць іх не на хутары, а ў падвале дзевяціпавярховага дома, у якім пражываюць сотні людзей, — задача складаная. А былі часы, калі кожны ведаў, што ёў на абед сусед.

Адбыўся суд. Аматар ракет Н., той, які хаваў ракету ў канапе, атрымаў паўтара года ўмоўна, а яго знаёмы за ракетны склад у падвале асуджаны на год і шэсць месяцаў строгага рэжыму. Здавалася б, справа закрыта. Але пракурор горада палічыў, што пакаранне мяккае і прыгавор апратэставаў. Тады адзін з асуджаных зрабіў заяву, што ракеты, магчыма, і не сапраўдныя, не баявыя, бо, на яго погляд, чамусьці вельмі лёгкія. Хаця, як гаварылася вышэй, спецыялісты далі ўжо сваё заключэнне: ракеты баявыя.

Брэсцкі абласны суд адправіў справу на даследаванне. Цяпер следству неабходна правесці эксперыментальны пуск ракеты і ўзарваць яе. Вось тады ўсё будзе ясна!? Хаця, хто яго ведае? А раптам ракета не ўзарвецца? Бывае і такое.

Для чаго патрэбны былі нябожчыку В. гэтыя злашчасныя ракеты? Сваякі гаварылі, што ён заўсёды праяўляў цікавасць да зброі. Але ж тут такі размах. Хутчэй за ўсё была задумка на ракетах зрабіць бізнес, бо кожная ракета сёння каштуе каля 10 млн. рублёў.

Але пытанні застаюцца. Тым больш, што гэты выпадак не выключэнне. Успомнім, як у Слоніме шафёр здаў міліцыі машыну са зброяй, у якой не аказалася гаспадара. Дык адкуль уся гэтая зброя? Хутчэй за ўсё, што гэта вынікі падзелу былой Савецкай Арміі. Дзялілі, вывозілі і кралі ўсё, што можна было пацягнуць. Зброю, амуніцыю, правіянт везлі машынамі на ўсход, у бок Расіі. Але ці ўсё гэта даходзіла да новага месца прызначэння? Відавочна, і ракеты «забыла» вайсковая часць, якая адышла да расійскай арміі. Да гэтай версіі схіляюцца і ў праваахоўных органах.

Колькі гэтай зброі асела на Беларусі, сказаць немагчыма. Але яна засталася, бо калі паразважаць, то прыходзіш да высновы, што з гранатамі і аўтаматамі праблем менш, чым з ракетамі. Іх можна было не толькі вывозіць, але і выносіць. Паклаў у кішэнь ці схаваў пад плашч-палатку і са склада — праз дзірку ў агароджы.

Не будзем прагназіраваць, але калі пакінутая зброя і «загаворыць», то тут нічога дзіўнага не будзе, бо для чагосьці яе прыхавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПАСТАНОВА КАБІНЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
№ 336

г. Мінск *22 мая 1996 г.*

АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ У ПАСТАНОВУ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД 14 ЛІПЕНЯ 1993 Г. № 466 І ПРЫЗНАННІ СТРАЦІЎШЫМІ СІЛУ НЕКАТОРЫХ РАШЭННЯЎ УРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ АТЭСТАЦЫІ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ

У адлаведнасці з пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 лютага 1996 г. № 94 Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь

пастанаўляе:

1. Унесці ў Пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 1993 г. № 466 «Аб зацвярджэнні Часовага палажэння аб прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 20, арт. 390; Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 8, арт. 186) наступныя змяненні:

у пункце 3.2 словы: «Атэстацыйнай калегіяй пры Міністэрстве адукацыі» замяніць словамі: «Вышэйшым атэстацыйным камітэтам»;

у Часовым палажэнні аб прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь, зацверджаным гэтай пастановай:

у пунктах 4, 14, 17, 18, 20, 24, 27 словы: «Атэстацыйнай калегіяй пры Міністэрстве адукацыі» замяніць словамі: «Вышэйшым атэстацыйным камітэтам»;

пункт 5 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5. Сведчаннем вышэйшай навукова-педагагічнай кваліфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца атэстаты дацэнта і прафесара дзяржаўнага ўзору, зацверджаемага Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь, якія выдаюцца Вышэйшым атэстацыйным камітэтам ва ўстаноўленым парадку»;

у пункце 13 слова «ведамства» замяніць словамі: «іншага цэнтральнага органа кіравання»;

у пункце 15:

у абзацы першым словы: «Атэстацыйнай калегіі пры Міністэрстве адукацыі» замяніць словамі: «Вышэйшым атэстацыйным камітэце»;

у абзацы трэцім словы: «Атэстацыйнай калегіі пры Міністэрстве адукацыі» замяніць словамі: «Вышэйшага атэстацыйнага камітэта»;

у пункце 16 словы: «Атэстацыйнай калегіі пры Міністэрстве адукацыі» і «гэтай калегіяй» замяніць адпаведна словамі: «Вышэйшым атэстацыйным камітэтам» і «гэтым камітэтам»;

у пункце 20 словы: «Атэстацыйнай калегіяй пры Міністэрстве адукацыі» і «гэтай калегіі» замяніць адпаведна словамі: «Вышэйшым атэстацыйным камітэтам» і «гэтага камітэта»;

2. Прызнаць страціўшымі сілу:

Пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 верасня 1992 г. № 563 «Аб часовым парадку прысваення вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 26, арт. 485);

Пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 мая 1994 г. № 329 «Аб дапаўненні саставу Вышэйшай атэстацыйнай камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1994 г., № 13, арт. 254);

пункт 9 Палажэння аб Міністэрстве адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 чэрвеня 1995 г. № (Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 1995 г. № 18, арт. 412).

3. Міністэрству адукацыі і навукі ў месячны тэрмін перадаць ва ўстаноўленым парадку Вышэйшаму атэстацыйнаму камітэту дакументы і іншыя матэрыялы, звязаныя з прысваеннем вучоных званняў дацэнта і прафесара.

Устанавіць, што тэрміны праходжання атэстацыйных спраў, якія не завершаны выкананнем у Атэстацыйнай калегіі пры Міністэрстве адукацыі і навукі, не перарываюцца і гэтыя справы падлягаюць разгляду Вышэйшым атэстацыйным камітэтам ва ўстаноўленым парадку.

4. Вышэйшаму атэстацыйнаму камітэту сумесна з Міністэрствам адукацыі і навукі, Акадэміяй навук Беларусі, іншымі зацікаўленымі распрацаваць узоры нацыянальных атэстатаў дацэнта і прафесара і ўнесці іх ва ўстаноўленым парадку на зацвярджэнне Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

5. Дадзеную пастанову ўвесці ў дзеянне з 1 чэрвеня 1996 г.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь М. ЧЫГІР.

«ДАБРО» МЫТНІ ДОРАГА КАШТУЕ

У выніку работы органаў мытні ў даходную частку бюджэту Беларусі за першы квартал бягучага года паступіла 898 млрд. рублёў, 838 млрд. рублёў было накіравана ў расійскі бюджэт, на 90 млрд. рублёў затрымана тавараў і рэчаў, якія вывозіліся за мяжу незаконна. Менавіта такія лічбы былі прыведзены ў час «круглага стала» ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы начальнікам упраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь Валерыем Ярашэўскім. Не яго думку, карціна на мытнях краіны склалася зусім не радасная.

Праблемы мытні

Сёлета неаднаразова ўзмацняліся меры па імпарту падакцызных тавараў (маркіруемых алкагольных і тытунёвых вырабаў). Цяпер забаронены іх увоз без наклееных акцызных марак. Такая мера прынята для блакіроўкі незаконнага ўвозу падобных тавараў. На сённяшні дзень зменшаны і ў радзе выпадкаў адменены экспартныя пошліны. Адменены падатак на дабаўленую вартасць і акцызы на тавары, экспартуемыя ў далёкае замежжа. Валерый Паўлавіч лічыць, што ўсё гэта павінна стымуляваць знешнегаспадарчую дзейнасць суб'ектаў гаспадарання Беларусі.

Але, на жаль, становішча на мяжы па-ранейшаму складанае. Вялікая загружанасць прапускных пунктаў. Напрыклад, на пераходзе «Варшаўскі мост» мытня бярэ 200 тыс. долараў плацяжоў у суткі. Адсутнічаюць элементарныя, нармальныя ўмовы для работы. У такіх сітуацыях паяўляецца глеба для злоўжыванняў з усіх бакоў, у тым ліку і з боку мытных службовых асоб. Яшчэ назіраюцца выпадкі атрымання хабару і неправамерных дзеянняў работнікаў мытні. Напомнім: атрыманне хабару ў памеры 100 долараў пагражае работніку мытні тэрмінам да 5 гадоў пазбаўлення волі.

Пагранічнікі папярэджваюць

Паводле сцвярджэння начальніка пагранкантролю штаба Галоўнага ўпраўлення пагранічных войскаў РБ Уладзіміра Ананіча, кожны год павялічваецца аб'ём перамяшчэння транспартных сродкаў праз мяжу на 25 працэнтаў. Трэба асобна адзначыць, што органы пагранкантролю ў апошні час сутыкнуліся з праблемай масавага фальшывага афармлення дакументаў. Існуюць «ліпавыя» арганізацыі, якія прапануюць жыхарам рэспублікі паскоранае афармленне замежных дакументаў за павышаную плату. У выніку вялікая колькасць людзей папаліся на вуду махляроў. Лічба падманутых перавышае ужо больш за 10 тысяч чалавек. Пагранічнікі яшчэ раз папярэджваюць: не будзьце вельмі даверлівымі.

Нашэсце нелегальнай міграцыі

Іншаземцы, якія прыбылі да нас з афра-азіяцкага рэгіёна, разглядаюць Беларусь як перавалачную базу на шляху ў Заходнюю Еўропу. Тэндэнцыя да расшырэння нелегальнай міграцыі захоўваецца ўжо на працягу некалькіх гадоў. Такая сітуацыя з'яўляецца праблемай не толькі Беларусі, але і ўсяго кантынента, паколькі грамадзяне з афра-азіяцкага кантынента спрабуюць перамясціцца ў больш багатыя заходнія краіны. Такія перамяшчэнні спыніць асабліва цяжка: яны рыхтуюцца загадзя і вельмі старанна. Для дзялкоў ценявога бізнесу арганізацыя нелегальнай міграцыі з'яўляецца велізарным артыкулам даходу. Перамяшчэнні праходзяць па каналах Беларусі, Польшчы і Украіны. Адшукаць арганізатара, які б панёс пакаранне, практычна немагчыма. Людзей, якія пераязджаюць, можна прыцягнуць да адказнасці толькі за незаконнае знаходжанне ў зоне і за спробу незаконнага перасячэння граніцы. Да крымінальнай адказнасці, натуральна, справа не даходзіць. Трэба растлумачыць, што цяжкасці з прадухіленнем нелегальнай міграцыі звязаны з адсутнасцю ў нашай краіне міграцыйнага заканадаўства.

Візавая дзяржаўная палітыка

З набыццём самастойнасці Беларусь пачала фарміраваць і сваю візавую палітыку. Яна заключаецца ў пагадненнях і канвенцыях, якія краіна заключыла з дзяржавамі па візавых ці бязвізавых пытаннях. Паводле паведамлення начальніка пашпартна-візавага аддзела Міністэрства замежных спраў Уладзіміра Матусевіча, Беларусь заключыла дагаворы з 10 краінамі па бязвізаваму перамяшчэнню без абмежавання. На сённяшні дзень дзейнічае 25 пагадненняў па візавых пытаннях, на 7 краін распаўсюджваецца бязвізавы рэжым для абмежаванай катэгорыі грамадзян. Паміж Беларуссю і Літвой візавае перасячэнне граніцы. Аднак, улічваючы той факт, што ў Літве пражывае больш як 100 тыс. этнічных беларусаў, паміж краінамі было заключана асобнае пагадненне. Згодна з ім грамадзяне, якія даказалі сваё паходжанне з Беларусі і прадставілі адпаведныя дакументы, атрымліваюць пасведчанне на права шматразовага наведвання РБ тэрмінам да 2 гадоў. Віза не патрэбна пры перасячэнні мяжы асобам, старэйшым за 60 гадоў. Па сутнасці, адносіны Беларусі з кожнай краінай маюць свае асаблівасці. Напрыклад, з Чэхіяй і Славакіяй існуе поўны бязвізавы рэжым. А Славенія і Харватыя ўвялі для Беларусі візавы рэжым у аднабаковым парадку. На ўмовах узаемнасці нашай краіне таксама прыйшлося ўвесці візавы рэжым для грамадзян гэтых краін.

Уладзімір Матусевіч паведаміў, што МЗС распрацаваны два ўзоры пашпартоў — дыпламатычны і службовы. Яны будуць выкарыстоўвацца ў сувязі з указам Прэзідэнта па новай сімволіцы. Выпушчана ў абарачэнне візавая марка, якую атрымліваюць усе замежныя грамадзяне пры візавым уездзе ў нашу рэспубліку. Марка выканана ў еўрапейскім стылі і мае 12 ступеняў абароны. Прымяненне візавай маркі паказала, што яна аказалася не па зубах фірмам, якія займаліся падробкай візавых штампаў.

Пытанні грамадзянства

За межамі Беларусі пражывае больш як 7 тысяч беларусаў, якія былі зарэгістраваны ў консульскіх аддзяленнях. Многія грамадзяне яшчэ не звярталіся ў консульствы аб прызнанні свайго грамадзянства. Становішча пачало выпраўляцца ў 1995 годзе, калі было пададзена 156 заяў аб прызнанні грамадзянства. Аднак назіраюцца выпадкі, калі людзі адмаўляюцца ад беларускага грамадзянства. Толькі летась Беларусь страціла такім чынам 43 чалавекі, а сёлета падалі заявы аб выхадзе з беларускага грамадзянства 59 чалавек.

Паводле паведамлення консульскага ўпраўлення МЗС Беларусі, не ўсе грамадзяне нашай краіны вядуць сябе за мяжой прыкладна.

На 1 красавіка 1996 года ва ўсім свеце затрымана 460 грамадзян Беларусі, адбываюць пакаранне 258 чалавек. Самы вялікі аб'ём парушэнняў прыпадае на Польшчу. Тут затрымана 339 чалавек, а адбываюць пакаранне каля 200. Любяць пабуяніць нашы землякі на Украіне, там іх затрымана 36 чалавек і 8 адбываюць пакаранне. У асноўным грамадзяне Беларусі адбываюць пакаранне за ўгон аўтамабіляў і перагон украдзенага аўтатранспарту. Многа нашых грамадзян затрымліваюць за гандаль спіртнымі напоямі ў сувязі з увядзеннем акцызных марак. У Польшчы, напрыклад, за такія парушэнні пагражае штраф у памеры некалькіх дзесяткаў тысяч долараў або пазбаўленне волі да 3 гадоў.

Сяргей КУРКАЧ.

АБМЯРКОЎВАЕМ РЭФОРМУ ШКОЛЫ

Не загубіць бы Ламаносавых у глыбінцы...

Нашы чытачы пішуць Івану ШАМЯКІНУ, Васілю СТРАЖАВУ і звяртаюцца да Аляксандра ЛУКАШЭНКІ

За палітычнымі ўзрушэннямі можна прагледзець уласную будучыню. Прынамсі, на нейкі час мы сапраўды сталі менш пісаць пра маючую адбыцца рэформу сярэдняй школы. І чытач адразу задаўся пытаннем (цытуем Яўгена Васільева з Асіповіцкага раёна): «Чаму абмеркаванне канцэпцыі перабудовы школы так мала знаходзіць месца на старонках газет? Няма пісьмаў, ці проста мае месца замоўчванне праблемы? Калі замоўчванне, то гэта таксама абмеркаванне: для чыноўніка».

Замоўчвання няма, Яўген Цімафеевіч, але няма і вялікага патоку пісьмаў, як чакалася. За паўгода — мо з дзесятак. Мы тут у сябе ў рэдакцыі дзівімся: у кожнай лічы, сям'і ёсць вучні і іх бацькі, сённяшнія ці ўчарашнія. Няўжо нецікава, чым жыве і як збіраецца жыць школа?

Але звернемся да пісьмаў. Большасць з іх — гэта рэзананс на артыкул Івана Пятровіча Шамякіна «Сацыяльная і нацыянальная справядлівасць — аснова любой рэформы» ў «Звяздзе» за 1 сакавіка.

«Мы, настаўнікі Конкавіцкай сярэдняй школы Петрыкаўскага раёна, з вялікай зацікаўленасцю прачыталі артыкул выдатнага народнага пісьменніка Беларусі, нашага земляка І. П. Шамякіна і прыйшлі да высновы, што нашы погляды поўнасцю супадаюць... Ён выказвае думкі ўсяго нашага калектыву, а магчыма, і ўсяго беларускага народа».

Дванаццаць аўтараў гэтага пісьма лічаць, што паколькі статус у рускай і беларускай моў аднолькавы, то і патрабаванні (відаць, адносіны. - У.Х.) да іх як у школе, так і ў ВНУ павінны быць аднолькавыя. У прыватнасці, выпускныя экзамены за сярэднюю школу і прыёмныя ў ВНУ — абавязкова па дзвюх мовах. Яшчэ і для таго, каб «закрыць усе пралазы для лайдакоў».

Настаўніца-пенсіянерка Вера Бараноўская з Салігорскага раёна мяркуе, што Іван Шамякін «справядліва падаў голас супраць рэфарматараў, якія хочуць давесці нашу школу да развалу, так як палітыкі давялі эканоміку, а многіх людзей зрабілі жабракамі, растапталі наша жыццё».

Вера Рыгораўна ўпэўнена, што рэфарматары ўжо «падзялілі і нашых дзяцей, і ўнукаў на багатых і бедных». Бо, скончыўшы 10 класаў, яшчэ два гады вучыцца, а потым толькі трапіць у інстытут, не змогуць бедныя, тым больш сельскія дзеці. Нават самыя здольныя запоўняць падаротні».

Тая ж праблема хвалюе і Зінаіду Скачкову, дырэктара Батвінаўскай сярэдняй школы, што на Крычаўшчыне. Школе, дарэчы, сёлета — 90 гадоў. Як піша дырэктар, з яе сцен выйшлі дзесяткі вучоных, мастакоў, інжынераў, афіцэраў. Адных настаўнікаў — звыш 150-ці. Зараз жа, у адпаведнасці з праектам структуры 12-гадовай адукацыі, задача сярэдняй школы зведзена толькі да ўзроўню базавай. Яе выпускніку будзе закрыта дарога ў ВНУ. Далёка не кожны юнак ці дзяўчына з вёскі будуць мець магчымасць прайсці праз ліцэй ці каледж. Не загубіць бы Ламаносавых у глыбінцы...»

Навошта школьніку, каб дасягнуць сваёй запаветнай мары аб вышэйшай адукацыі, абавязкова трэба прайсці праз ліцэй, каледж, вучылішча, пытаецца З. Скачкова. Ці па кішэні будзе бацькам адпраўляць сваё дзіця некуды на два гады толькі для таго, каб яно падрыхтавалася (!) да экзаменаў у ВНУ?

Хаця аўтар пісьма разумее, што «зараз практыкуецца самы мясавы базавы ўзровень навучання, які не дае дастатковай падрыхтоўкі для паступлення ў ВНУ. І ўсё гэта падаецца пад соусам «гуманізацыі»...

Гаворачы пра пагрозу «духоўнага Чарнобыля», дырэктар расказвае, што недзе ў цішы кабінетаў нарадзілася «ідэя» наконт аб'яднання сельскіх і школьных бібліятэк. Ад яе, лічыць З. Скачкова, не будзе карысці, як і ад скарачэння ў школах (яно плануецца на наступны навучальны год) паловы існуючай стаўкі намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце і паловы стаўкі піянераважатай. Ва ўмовах, калі бездухоўнасць паўзе ва ўсе шчыліны, адзінай перашкодай на яе шляху ў вёсцы да гэтага часу была школа. Ці застанецца?..

Строгі і лаканічны ўжо знаёмы нам Яўген Васільеў. Чаму новая школа атрымлівае назву сярэдняй, пытаецца ён, калі не дае права паступлення ў ВНУ? «Па-другое, шлях да вышэйшай адукацыі будзе вельмі і вельмі абмежаваны для жыхароў сельскай мясцовасці. Таму, што шчыльная сетка ПТВ, ліцэяў і каледжаў (чамусьці забыліся пра гімназіі) існуе пакуль што на паперы». Васільеў робіць выснову: «Каб адсекчы ад спецыяльнай адукацыі такую колькасць людзей, трэба мець смеласць, калі гэта можна назваць смеласцю...»

Але ў рэдакцыю напісалі не толькі тыя, хто цалкам згодны з Іванам Пятровічам Шамякіным. За дыферэнцыраваную сістэму навучання паважліва заступіўся Леанід Гаўрылкевіч, настаўнік гісторыі Вішнеўскай сярэдняй школы (Смаргонскі раён). І за рэформу ў цалым. «Я веру ў рэформы і маладую каманду рэфарматараў», — піша ён.

Але ёсць свае крытыкі і ў міністра адукацыі і навукі Васіля Стражава. Вячаслаў Сухарэўскі з вёскі Русіны Баранавіцкага раёна свайму лісту даў такі вось загаловак: «Чаму разбойнічае міністр Стражаў?» Гутарка ідзе аб моўнай палітыцы ў школе. Альбо возьмем вось гэты ліст. «Вы сказалі, што вы шмат робіце, каб кожны ведаў дзве мовы. Вы, фактычна, нічога не робіце для гэтага. А робіце ўсё, каб знішчыць мову».

Далей Зося Спрык са Смаргоні, крыху памякчэўшы, дае міністру, што называецца, шанц. «У душы, магчыма, вы і любіце народ, мову, а дзейнічаеце па загаду...

Вы ж цудоўна размаўляеце па-беларуску, выгляд у вас добразычлівага беларуса, а вось смеласці няма. Трэба выхоўваць (у сабе) грамадзяніна... Я чамусьці ўпэўнена, што вы не дапусціце знішчэння народа».

Як бачым, аўтар ад праблем адукацыі перайшла да праблем роднай мовы, лёсу народа. І не яна адна бачыць паміж усімі гэтымі паняццямі цесную сувязь.

Г. Тарасевіч з Гродна, спасылаючыся на інтэрв'ю В. Стражава нашай газеце ад 12 сакавіка, у прыватнасці, на яго фразу аб праве бацькоў выбіраць мову навучання для сваіх дзяцей, пытаецца: «А якую ж мову навучання можа выбраць большасць нашых дэнацыяналізаваных, практычных бацькоў, калі яна не бачыць ніякай перспектывы для беларускай мовы ў сваёй жа краіне? Бо яна практычна нідзе не прыняцяецца — няма ні ВНУ, ні спецыяльных устаноў з беларускай мовай навучання. І якая тады будучыня ўсяго беларускага ў нашай беларускай дзяржаве? Бо ўсё ж пачынаецца з дзяцінства. Адкуль могуць узяцца свядомыя грамадзяне — патрыёты Беларусі, калі ў садках, школах пачаўся пад націскам уладных структур і волі бацькоў масавы адыход ад усяго беларускага? Дык ці ёсць будучыня ў беларускага народа?»

Разважаючы ў тым жа ключы, Леанід Гаўрылкевіч пераканаць, што справу можна паправіць, калі зменяцца адносіны да матчынай мовы з боку ўладаў. «Лічу, што ўсе дзяржаўныя мужы — ад Прэзідэнта да старшыні сельвыканкома — павінны размаўляць пры выкананні службовых абавязкаў на матчынай мове».

Свае прапановы ў сувязі з рэфарміраваннем школы прыслалі або перадалі ў рэдакцыю прафесар П. Манастырны з Мінска, Таццяна Волкава з Барысава, дэкан факультэта замежных моў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта Л. Рычкова (аўтар піша аб неабходнасці рэфарміраваць і вышэйшую школу), іншыя нашы чытачы.

Як вы заўважылі, мы практычна не каменцируем пісьмы. Мы пераказваем галоўнае ў іх змесце. Каб нікога незнарок не пакрыўдзіць. Бо кожны мае права на асабістую думку і права падзяліцца ёю.

Запрашаем да працягу размову. Мы ж дамовіліся, што гэта будзе наш з вамі маленькі рэферэндум?

Агляд пісьмаў падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

Развіццё энергетыкі — сталбавая дарога цывілізацыі

Калі ў бліжэйшыя гады не адбудзецца ніякіх змен у стаўленні да энергетычнай сферы краіны, то да 2000 года 50 працэнтаў энергетычных магутнасцей працаваць не будуць.

А ў 2007—2010 гадах у нас застанецца ўсяго толькі 15 працэнтаў энергамагутнасцей. І гэта не гаворыць пра забяспячэнне новых магчымасцей для сілкавання прамысловасці, увогуле вытворчасці, увогуле жыццядзейнасці. Вучонымі даказана, што за кожныя дваццаць гадоў патрэба ў энергаспажыванні ўзрастае ў 2,5 раза, хаця народанасельніцтва за гэты ж час павялічваецца толькі ў 1,5 раза. Пра гэта і іншыя важкія энергетычныя пытанні ішла размова на пасяджэнні «круглага стала» ў грамадскім прэс-цэнтры Беларускага Дома друку. Тэма размова была вызначана наступным чынам: «Праблемы энергіі сёння. Энергазбяражэнне. Экалагічная бяспека энергасістэм. Нетрадыцыйныя крыніцы энергіі. Праблемы навукі». На сустрэчу з журналістамі прыйшлі ўдзельнікі міжнароднай навуковай канферэнцыі па цепламасаабмену, акадэмік Алег Мартынаў, член-карэспандэнт АНБ Мікалай Паўлюкевіч, вучоныя з Расіі, Украіны і ЗША Юрый Паляжаеў, Анатоль Далінскі і Біл Бегел.

Упершыню канферэнцыя па цепламасаабмену была праведзена ў Мінску ў 1961 годзе. З таго часу ў беларускай сталіцы адзін раз у чатыры гады збіраюцца вучоныя ўсяго свету, каб абмеркаваць самыя разнастайныя праблемы энергетычнага жыццезабеспячэння.

Навукоўцаў непакоіць, што напрыканцы стагоддзя, тысячагоддзя, калі ўсё болей і болей шырыцца навукова-тэхнічны прагрэс, мы як быццам патрапляем у заложнікі старога часу. Дзяржава застаецца безуважнай да многіх навуковых і практычных праблем у сферы энергетыкі. На думку дырэктара Інстытута цепла- і масаабмену імя Лыкава АН Беларусі Алега Мартыненкі і яго калег, перашкодай служыць і раз'яднанасць вучоных на прасторах СНД, і цяжкае сённяшняе фінансавае становішча ўвогуле навукі. Як прыклад — адсутнасць часам магчымасці адправіць вучонага ў камандзіроўку нават у блізкае замежжа. Вось на Украіне (пра гэта падрабязна расказаў акадэмік Анатоль Далінскі) вялікая ўвага надаецца нетрадыцыйным крыніцам энергіі. У прыватнасці, для вучоных усяго СНД ствараецца школа па геатэрмальнай энергетыцы. Украіна знаходзіцца на выразным разломе зямной кары. І там ёсць усе шанцы выкарыстаць гэтую асаблівасць. Але ж ці будуць браць урокі ва ўкраінскіх калег нашы беларускія вучоныя? Па меркаванню А. Мартыненкі, Беларусь на 6-7 працэнтаў магла б забяспечваць сябе і гэтым відам энергіі.

Акадэмік А. Мартыненка звярнуў увагу на мэтазгоднасць завяршэння будаўніцтва Мінскай ТЭЦ-5. Але патрэбны велізарныя грашовыя сродкі. Адзін са шляхоў іх атрымання — інвестыцыі. Магчыма, яны і знойдуцца, але ж патрэбна і ўвага, спрыянне інвестарам, пэўныя гарантыі з боку дзяржавы.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

ПОГЛЯД

Нас наведала місія МВФ...

Як паведамлялася ўжо, рэспубліку ў канцы красавіка — пачатку мая ў чарговы раз наведала місія Міжнароднага валютнага фонду, які працягвае вывучаць наша эканамічнае становішча. Вядома, на прадмет далейшага супрацоўніцтва, г. зн. выдзялення крэдытаў. Місія пакінула пасля сябе пісьмовае заключэнне, па якім можна меркаваць: яна намі, мякка кажучы, не зусім задаволена.

Найперш эканамічнае становішча рэспублікі, пачынаючы з 1995 года, называецца неадназначным. Са станоўчых момантаў адзначаецца рэзкае паніжэнне інфляцыі. Аднак к канцу мінулага года, на погляд місіі, крэдытна-грашовая і знешнеэканамічная палітыка стала непрымальнай, у выніку эканамічная сітуацыя пачала пагаршацца; узрасло дзяржаўнае ўмяшанне ў эканоміку. Што датычыць цяперашняга часу, місія зазначае: апошнія афіцыйныя даныя ўказваюць на павелічэнне рэальных аб'ёмаў у асобных сектарах эканомікі, аднак фінансавае становішча большасці прадпрыемстваў пагоршылася ў сувязі з затаварваннем гатовай прадукцыяй, працягвае расці іх знешняя і ўнутраная запазычанасць. Становішча ў бюджэтнай сферы, нягледзячы на адносна нізкі ўзровень дэфіцыту бюджэту, названа хісткім. У структуры фактычных расходаў місія ўбачыла тэндэнцыю да празмернага павелічэння сацыяльных выплат, субсідый, у той жа час фінансавае становішча фонду сацыяльнай абароны, канстатуе яна, — слабае.

Місія адзначае сур'ёзнае пагаршэнне канкурэнтаздольнасці нашых суб'ектаў гаспадарання на знешнім рынку, ціск на абменны курс, нізкі ўзровень замежных рэзерваў Нацыянальнага банка (пры гэтым гаворыцца пра яго няздольнасць незалежна вызначаць і праводзіць неабходную крэдытна-грашовую палітыку), адток капіталу, спыненне структурных пераўтварэнняў. Намаганні па паляпшэнню фінансавага становішча суб'ектаў гаспадарання, гаворыцца ў заключэнні місіі, набываюць форму льгот па падатках і тарыфах, субсідзіравання экспарту, часовага зніжэння кошту энерганосьбітаў і адтэрміноўкі плацяжоў па пратэрмінаванай запазычанасці, што, тым не менш, не садзейнічае істотнаму паляпшэнню рэнтабельнасці прадпрыемстваў.

На яе думку, адмоўныя вынікі будзе мець выдзяленне шырокамаштабных трансфертаў, якое працягваецца, сельскай гаспадарцы, на будаўніцтва жылля або прамысловым прадпрыемствам у такой форме фінансавання, што робіць вяртанне сродкаў малаверагодным. Місія прыходзіць да высновы, што калі не зменіцца курс эканамічнай палітыкі, фінансавае становішча краіны яшчэ больш пагоршыцца; яна даводзіць: за кошт узмацнення адміністрацыйнага кантролю можна атрымаць толькі часовую (і частковую) перадышку.

Адлаведна, даюцца пэўныя рэкамендацыі, прычым за аснову прапануецца ўзяць тыя рэкамендацыі, якія ўтрымліваюцца ў памятнай запісцы місіі ад 8 лютага. Яна

ГЭТА МЫ — НАРОД БЕЛАРУСІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Самым яркім эмацыянальным момантам свята была прэзентацыя на цэнтральных вуліцах Гродні «нацыянальных падворкаў». На іх можна было ўбачыць прадстаўнікоў той ці іншай нацыянальнасці ў народных касцюмах, паспытаць нацыянальныя стравы, паглядзець танцы і пачуць нацыянальную музыку. Безумоўна, кожны хацеў паказаць сябе як найлепш. Тут, на нацыянальных падворках, я змагла пагутарыць з людзьмі, даведацца, якія ў іх праблемы. Арыф Алекпераў, напрыклад, які з'яўляецца віцэ-прэзідэнтам азербайджанскай абшчыны «Габустан», паведаміў, што толькі ў Мінску пражывае каля дзвюх тысяч яго суайчыннікаў. Сам ён — кандыдат тэхнічных навук, у свой час скончыў беларускую ВНУ. Большасць членаў азербайджанскай абшчыны — высокакваліфікаваныя спецыялісты з дыпломамі, працуюць у сферы навукі, прамысловасці і прыватнага бізнесу.

— Але ці можам мы адчуваць сябе камфортна, — гаворыць ён, — калі маіх землякоў, як асоб «каўказскай нацыянальнасці», без усялякіх падстаў спыняюць на вуліцы міліцыянеры і патрабуюць дакументы для праверкі, падвяргаюць зневажальным роспытам, якія заканчваюцца зняццем адбіткаў пальцаў...

Што я магла сказаць у адказ Арыфу Алекпераву? Што ў Рэспубліцы Беларусь кепская міграцыйная сітуацыя, у нас аселі, паводле прыблізных даных, 200—300 тысяч нелегальных мігрантаў, а крымінальнае асяроддзе фарміруецца якраз з нелегалаў з паўднёвых краін былога СССР? Мне было соромна глядзець у вочы Арыфу Алекпераву. Прыгадалася адна дэталь, расказаная мне старшынёй таварыства «Суродзіч» з Якуці Таццянай Кавалёвай. Кіраўнік Якуцкага МВД, напрыклад, сістэматычна збірае ў сябе кіраўнікоў нацыянальных суполак і даводзіць да іх ведама, прадстаўнікі якіх нацыянальнасцей у Якуціі ўчынілі тыя ці іншыя правапарушэнні. Цікава, што гаворка пры гэтым, як правіла, не ідзе пра саміх якутаў. Адчуваеце?

Арыф Алекпераў з болем казаў мне пра тое, што ўжо доўгі час азербайджанская абшчына просіць Мінскі гарвыканком выдзеліць ім памяшканне. Віцэ-прэм'ер У. Русакевіч публічна паабяцаў, што да 1 ліпеня ўсе нацыянальныя суполкі будуць забяспечаны памяшканнямі. Часу засталося зусім мала.



На карэйскім падворку я пазнаёмілася з Тэн Аўрорай Канстанцінаўнай. Пакуль дзяўчаты ў прыгожых нацыянальных касцюмах выконвалі народны танец, яна паведаміла мне, што ўсе тутэйшыя карэйцы лічаць сваёй радзімай Беларусь. Моладзь ведае беларускую мову лепей, чым карэйскую. А на маё пытанне, кім яны сябе адчуваюць, так і не змагла адказаць дакладна.

... На нямецкім падворку мяне пачаставалі халодным півам. Спадар Аляксандр Майснер, які з'яўляецца старшынёй Беларускага таварыства немцаў «Адраджэнне» і сябрам міждзяржаўнай Рады немцаў былога СССР, сказаў:

— На жаль, грамадскую атмасферу ў краіне я ацэньваю як даволі неспрыяльную. І гэта падштурхоўвае беларускіх немцаў ад'язджаць на гістарычную радзіму, хаця мы ўсе моцна звязаны з гэтай зямлёй, палюбілі Беларусь.

Як бачыце, фестываль аказаўся не толькі прыгожым балем, дзе прэзентавалі сябе ўсе нацыі. Ён даў магчымасць уявіць рэальную карціну сумеснага пражывання народаў у Рэспубліцы Беларусь і зразумець, што не так усё бесправлемна ў нас у гэтым плане. Фэсты, на якіх дэкларуюцца і дэманструюцца добрыя намеры дзяржавы, яшчэ не з'яўляюцца гарантам сапраўднага клопату дзяржавы пра нацыянальныя меншасці ў краіне. І нацыянальная большасць — беларусы — часта аказваюцца тут, як мы ведаем, у становішчы нацыянальнай меншасці.

Не хацелася б заканчваць на гэтай сумнай ноце. Тым больш, што арганізатары фестывалю сапраўды зрабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб ён адбыўся, каб усе мы — беларусы і небеларусы, што жывуць на гэтай зямлі, змаглі адчуваць сябе адным народам, які нясе адказнасць за ўсё, што тут адбываецца, каб любілі Беларусь і ганарыліся ёй, каб сумесна будавалі новае, дэмакратычнае грамадства.

Таццяна АНТОНАВА.

У СВЕЦЕ
ПЕЛЕНГ-НАВІНЫ

● **ДАГАВОР ЗАБЯСПЕЧАНЫ ГАРАНТЫЯМІ ПРЭЗІДЭНТА РАСІІ**

У панядзелак у Крамлі ўсё ж пачаліся перамовы паміж Расіяй і Чачнёй. Перамовы праходзілі за зачыненымі дзвярамі. 27 мая ўвечары было падпісана пагадненне аб спыненні з 1 чэрвеня ўсіх баявых дзеянняў у Чачні. У двухтыднёвы тэрмін павінны быць вызвалены ўсе сілай утрымліваемыя. Ёсць усе падставы меркаваць, што новы дагавор, забяспечаны гарантыямі самога прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына, не падзеліць лёсу дагавораў, заключаных на ранніх стадыях канфлікту. Перамовы працягваюцца.

● **ЧАЧЭНСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ НЕ ВЕДАЕ НАВАТ, ДЗЕ ЯЕ РАЗМЯСЦІЛІ**

Прадстаўнікі дэлегацыі чачэнскай узброенай апазіцыі, якія прыбылі 27 мая на перамовы з расійскім кіраўніцтвам у Маскву, пасля іх заканчэння ў панядзелак позна ўвечары былі размешчаны на адной з прадстаўнічых дач у бліжнім Падмаскоўі. Ніхто з прыбыўшых нават прыблізна не здагадваецца, дзе яны пражываюць і хто іх ахоўвае. Яны не ведаюць нават нумар тэлефона, які знаходзіцца на дачы.

● **ЗАЎГАЕЎ РЫХТУЕЦЦА ДА ВІЗІТУ ЕЛЬЦЫНА**

Кіраўнік Чачні Доку Заўгаеў не стаў чакаць завяршэння перамоў у Маскве і вылецеў у ноч на аўторак у Грозны. Зараз Заўгаеў займаецца актыўнай падрыхтоўкай да візіту прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына.

● **КУДЫ ЗБІРАЛАСЯ ЎДАВА ДУДАЕВА?**

Па звестках кіраўніцтва ўзброенай апазіцыі, удава Джахара Дудаева Ала затрымана ў панядзелак у аэрапорце сталіцы Кабардзіна-Балкарыі. Як паведамілі карэспандэнту Інтэрфакса ў галоўным штабе баевікоў, прычынай затрымання з'явілася тое, што Ала Дудаева накіроўвалася па дакументах, афармленых на імя іншага чалавека. Паводле даных узброенай апазіцыі, яе прыхільнікі маюць намер правесці ў адным з гарадоў Турцыі, дзе размешчана іх прадстаўніцтва, прэс-канферэнцыю на гэту тэму ў самы бліжэйшы час.

Радыё «Свабода», «Голас Амерыкі», Радыё 101,2 і «Радыё-РОКС» слухаў Сяргей ПРОТАС.

ІНФАРМ-КАКТЭЙЛЬ

У самым сэрцы афрыканскага кантынента жывуць сланы-пігмеі. З выгляду яны падобныя на звычайных сланоў. Але іх рост не перавышае 40 сантыметраў. А іх дзеці ў даўжыню маюць усяго 10 сантыметраў. Калі слонікі пачынаюць «трубіць», гэта выклікае лагодную ўсмешку, бо нагадвае піск. Аб існаванні сланоў-пігмеяў стала вядома, калі на іх выпадкова натрапіў амерыканскі заолаг Норман Сміт. Зараз існаванне гэтых сланоў знаходзіцца пад пагрозай. З'явілася нямала браканьераў, якія іх адлоўліваюць і прадаюць за вялікія грошы.

«Пуркуа-па»

Дзіця было знойдзена ў вадасцёкавым канале маленькага амерыканскага гарадка. Выкліканая «хуткая дапамога» ў вокамгненне прыбыла на месца здарэння, аднак урач мог толькі канстатаваць: ніякіх жыццёвых функцый не назіраецца.

Ён тут жа склаў пасведчанне аб смерці, дзіця адправілі ў бальніцу і перадалі патолагаанатаму. Аднак, рыхтуючыся да анатаміравання, хірург быў здзіўлены: немаўля — гэта ўсяго толькі лялька. Значыць, урач «хуткай дапамогі» не памыліўся: жыццёвых функцый у яе сапраўды не было.

ЭКСТРА-ПРЭС

Да рызыкі больш схільныя жанчыны. Пры гэтым яны прымаюць больш канкратныя і хуткія рашэнні. Такую выснову можна зрабіць з даследавання, якое правяла школа менеджменту і фінансаў пры Нотынгемскім універсітэце. Прадстаўніцы слабага полу часцей не звяртаюць увагі на небяспеку як у дзелавой сферы, так і на скачках, дзе яны таксама больш удачлівыя.

«Труд»

НАПЯРЭДАДНІ

Прафсаюзы выказваюць патрабаванні да парламента

З 29 мая Асацыяцыя незалежных прафсаюзаў прамысловасці Беларусі мае намер распачаць пікетаванне Вярхоўнага Савета. Мэта акцыі — падштурхнуць парламент да прыняцця закона аб наданні заработнай плаце статусу першачарговага плацяжу. Напярэдадні гэтай падзеі наш карэспандэнт гутарыць з сакратаром Асацыяцыі Мікалаем Герасіменкам.

— Вядома, што пытанне аб наданні заработнай плаце статусу першачарговага плацяжу па сутнасці ўжо вырашана. З улікам гэтага ці мае сэнс запланаваная акцыя?

— Сітуацыя, калі Прэзідэнт выдае ўказ аб своечасовай выплаце заробкаў, — з'ява ненармальная. Для гэтага патрэбна перш-наперш прававая аснова. Патрэбны прыняты Вярхоўным Саветам закон, на падставе якога прафсаюзы атрымаюць права патрабаваць выплаты заробкаў праз суд.

— Да якога часу прафсаюзы плануюць працягваць пікетаванне?

— Да прыняцця Вярхоўным Саветам адпаведнага закона.

— А калі не атрымаецца?

— Наша асноўная на сёння задача — прымусіць найманікаў разлічыцца па зарплаце. Гэтай мэты мы мяркуем дамагацца самымі рознымі сродкамі, аж да забастовак. Аднак пры гэтым, варта адзначыць, прафсаюзы будуць дзейнічаць строга ў рамках закона.

— Але, калі шчыра, ці ўпэўнены вы, што заканадаўчае наданне заработнай плаце статусу першачарговага плацяжу — менавіта той крок, які вырашыць праблему?

— Было б наіўна меркаваць, што адным заканадаўчым актам магчыма кардынальна змяніць сітуацыю. Бо не варта гаварыць лішніх слоў пра агульны стан рэчаў: няма абаротных сродкаў, няма збыту прадукцыі. Таму для вырашэння праблемы патрабуюцца і іншыя законы — аб развіцці выторчай базы прадпрыемстваў, аб інвестыцыях і г. д.

Але разам з тым вядома: ёсць прадпрыемствы, якія працуюць больш-менш стабільна, але на іх усё роўна затрымліваецца зарплата. У першую чаргу, каб абараніць рабочых такіх прадпрыемстваў. Асацыяцыя незалежных прафсаюзаў прамысловасці і распачне пікетаванне парламента.

Сяргей ГРЫБ.

БЕЛАРУСЬ І СВЕТ

Андрэй САННІКАЎ:

«Міжнародныя арганізацыі — унікальныя скарбніцы ведаў і вопыту, але карыстацца імі не так проста, як можа здацца на першы погляд»

Беларусь і супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі — тэма гутаркі нашага карэспандэнта з Андрэем Саннікавым, намеснікам міністра замежных спраў. Андрэй Алегавіч — кар'ерны дыпламат, доўгі тэрмін працаваў у і пры міжнародных арганізацыях.

— Навошта ўвогуле дзяржавы аб'ядноўваюцца ў міжнародныя арганізацыі?

— У першую чаргу для ўмацавання сваёй бяспекі і міру ў свеце. Прычым бяспекі не толькі ваеннай, але і эканамічнай, палітычнай, экалагічнай... Гэта тая галоўная прычына, якая вымушае нацыянальных лідэраў ці іх прадстаўнікоў збірацца разам за адным сталом, выпрацоўваць агульныя правілы гульні, выкананне якіх дазваляе ў большасці рэгіёнаў планеты падтрымліваць больш-менш устойлівы парадак.

Вось гэта відавочная эфектыўнасць міжнародных арганізацый, нягледзячы на істотныя памылкі і пралікі ў іх дзейнасці, зрабіла папулярнай недзе ў 70—80-х гадах нашага стагоддзя ідэю глабалізацыі сусветных працэсаў і кіравання імі. Тады модна было разважаць наконт сусветных парламента і нават урада.

Гэта цікавая і небясспрэчная ідэя так і засталася нерэалізаванай. Ступень развіцця міжнародных адносінаў у той час не пакідала на гэта аніякіх надзей. І, думаецца, яшчэ доўга прыйдзецца чакаць. Магчыма, лабараторыя Еўрапейскага саюза, пры ўмове поспеху інтэграцыйных працэсаў у яго межах, унясе свой практычны ўклад у ажыццяўленне гэтай прыгожай ідэі.

Хаця, трэба заўважыць, ужо сёння некаторыя міжнародныя арганізацыі часткова набылі функцыі міжнацыянальных органаў. Напрыклад, Сусветная арганізацыя аховы здароўя ў пэўным сэнсе з'яўляецца міністэрствам аховы здароўя планеты. З гэткім жа поспехам можна назваць Міжнародную арганізацыю працы універсальным сусветным ведамствам па працы. А такую вядомую і паважаную арганізацыю, як ЮНЕСКО, ёсць падставы лічыць сусветным міністэрствам адукацыі і культуры. Вядома, не ў нашым звыклым уяўленні аб міністэрстве, якое жорстка кантралюе тую ці іншую сферу дзейнасці.

Умоўную і спрошчаную аналогію з галіновым ведамствам я наўмысна прывёў для таго, каб чытачам «Звязды» былі больш зразумелымі функцыі буйных спецыялізаваных міжнародных арганізацый, кожная з якіх па меры сваіх магчымасцей дапамагае ўсім краінам авалодваць сусветным вопытам. Бо гэтыя арганізацыі — унікальныя скарбніцы ведаў, адкрытыя для іх удзельнікаў. Таму дзяржавы і пашыраюць сваё членства ў розных міжнародных арганізацыях, адсюль і іх вялікая колькасць.

Але, мушу заўважыць, карыстацца гэтымі скарбніцамі зусім не так проста, як можа здацца на першы погляд. Трэба ведаць, дзе і як узяць менавіта тое, што табе неабходна, выбраць з акіяна інфармацыі карысную для тваёй краіны, здолець яе прэпарываць, творча асэнсаваць і ўкараніць.

— Перад сустрэчай з вамі я пагартаў ёмісты даведнік міжнародных арганізацый. І, ведаеце, быў здзіўлены іх велізарнай колькасцю і неверагоднай разнастайнасцю тэматычных інтарэсаў і праблем, якія яны ахопліваюць. Вядома, што далёка не ў кожную арганізацыю нам трэба імкнуцца. Пры ўсім нашым жаданні наўрад ці ў бліжэйшай будучыні Беларусь можа разлічваць на паўнакроўнае членства ў так званай «вялікай сямёрцы». Малаперспектыўна, на мой погляд, таксама старацца стаць членам Міжнароднай арганізацыі па марскому даму. Але незразумела, чаму наша краіна, у якой даволі развіты аграрны сектар, упарта ігнаруе такую вядомую і аўтарытэтную сусветную арганізацыю вытворцаў сельгаспрадукцыі, як ФАО? Яна, наколькі мне вядома, уяўляе сабой надзвычай багатую скарбніцу інфармацыі. У сувязі з гэтым пытанне: па якому прынцыпу мы выбіраем членства ў той ці іншай міжнароднай арганізацыі?

— А вы дарэмна іранізуеце наконт марскіх арганізацый. Так, мы не маем выхаду да мора. Але гэта не значыць, што ў нас няма цікавасці да выкапняў марскога дна, якое належыць усім народам планеты. Шэльфы мораў і акіянаў тояць у сабе велізарныя багацці. І, хто ведае, можа ў XXI стагоддзі Беларусь пачне распрацоўваць свой участак дна. І менавіта адпаведныя міжнародныя арганізацыі праз прынятыя па іх ініцыятыве канвенцыі, дакументы аблегчаць доступ немарскім дзяржавам да марскіх сховішчаў.

А што датычыць членства ў ФАО, то я з вамі поўнасцю згодны — мы павінны былі б даўно ўступіць у яе, але гэта ўжо не кампетэнцыя Міністэрства замежных спраў.

Увогуле да членства ў міжнародных арганізацыях трэба падыходзіць вельмі ўважліва, умець бачыць і прадбачыць усе верагодныя наступствы. З набыццём незалежнасці Беларусь сутыкнулася з неабходнасцю ўступлення ў іншыя (а не толькі сістэмы ААН) міжнародныя арганізацыі. Акрамя гэтага ўзнікла патрэба перагледзець свой удзел там, дзе мы прысутнічалі толькі намінальна, служылі прыкрыццём для інтарэсаў СССР. Такія вось паўсталі дзве задачы.

Што датычыць першай, то для Беларусі вельмі карысным уяўляецца супрацоўніцтва з такой арганізацыяй, як АБСЕ. У яе мы, дарэчы, спрабавалі ўступіць яшчэ калі Беларусь была ў саставе СССР. Тады яна называлася Нарада па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ). АБСЕ стала першай буйной еўрапейскай арганізацыяй, у якой мы даволі хутка афармілі членства ў 1992 годзе.

Цяпер АБСЕ перажывае цяжкі перыяд. Яна пакутліва і ўпарта шукае сваё месца сярод іншых аўтарытэтных міжнародных арганізацый, асабліва ў сістэме еўрапейскай бяспекі. І я веру, што АБСЕ яшчэ скажа сваё слова.

Для нас надзвычай важна быць прынятымі ў Савет Еўропы.

У апошні час з'явіўся шэраг рэгіянальных міжнародных структур, з якімі Беларусі ёсць сэнс развіваць адносіны. Напрыклад, Цэнтральная еўрапейская ініцыятыва. Зараз мы знаходзімся ў стадыі ўступлення ў гэтую арганізацыю. Яна ўзнікла спачатку як аб'яднанне чатырох краін, а сёння ў яе ўваходзяць дзесяць дзяржаў плюс пяць асацыіраваных членаў. Сярод апошніх Беларусь, Украіна, Румынія, Балгарыя, Албанія.

Для нас удзел у гэтай арганізацыі карысны тым, што яна выступае ў ролі своеасаблівага маста паміж Усходняй і Заходняй Еўропай і займаецца вырашэннем практычных пытанняў у эканоміцы, прыгранічным гандлі, развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і г. д.

Нас цікавіць таксама і Савет дзяржаў Балтыйскага мора, бо Беларусь адносіцца да рэгіёна гэтага мора і мы, вядома, хацелі б падтрымліваць шырокія сувязі з Саветам. Увогуле, супрацоўніцтва з рэгіянальнымі арганізацыямі з'яўляецца для нас вельмі перспектыўным. Яны менш палітызаваныя, чым некаторыя іншыя сусветныя ці еўрапейскія арганізацыі.

— Безумоўна, да адмоўных «наступстваў» адносяцца ўзносы, якія непазбежна прыходзіцца плаціць за членства ў арганізацыі?

— Плаціць ці не плаціць, а калі плаціць, то колькі... Не такім павінен быць галоўны крытэрый пры вырашэнні пытання аб уступленні краіны ў міжнародную арганізацыю. Нам, паўтаруся, трэба навучыцца браць значна больш ад членства ў нейкай арганізацыі, чым мы ўносім туды ў якасці грашовага ўзносу. І гэта цалкам магчыма. Але і нельга адносіцца да міжнародных арганізацый як да «дойных кароў», бо большасць з іх не мае значных уласных сродкаў для ажыццяўлення выгадных Беларусі праектаў. Аднак яны распрацоўваюць і абгрунтоўваюць неабходнасць праектаў, сродкі пад якія потым прыходзяць з Іншых крыніц.

— У развіццё тэмы аб уменні браць для сябе ад супрацоўніцтва са знешнім светам не магу не спытаць вось яшчэ аб чым. Акрамя буйных міжнародных арганізацый, існуе шмат невялікіх арганізацый, розных фондаў, аб'яднанняў і г. д., праз якія можна далучыцца да карысных Беларусі праектаў, ініцыятыў, атрымаць фінансаванне.

Мы, на вялікі жаль, часта ўпускаем гэтыя магчымасці. Часам з-за элементарнага: не валодаем інфармацыяй, не ўмеем правільна напісаць і ў тэрмін даслаць заяўку ці зацікавіць сваім удзелам у праекце і г. д. У выніку страчваем сотні мільёнаў долараў, якія б працавалі на Беларусь.

— Тут недапрацоўваюць нашы міністэрствы і ведамствы. МЗС опрабуе выступаць каталізатарам шырокага і паўнацэннага нашага ўдзелу ў гэтым міжнародным супрацоўніцтве. Але знешнепалітычнае ведамства — гэта не той орган, які павінен займацца падобнай працай. У нас свае функцыі. Тым не менш, мы ніколі не адмаўлялі ў дыпламатычнай падтрымцы суб'ектам гаспадарання.

Але, напрыклад, я з горыччу назіраў у час работы ў Жэневе, як шмат мы губляем у галіне энергетыкі. Праблема гэта для Беларусі надзвычай важная. У рамках Еўрапейскай эканамічнай камісіі існуе шэраг праектаў па павышэнню энергаэфектыўнасці. Ёсць нават асобная праграма, яна так і называецца «Энергаэфектыўнасць-2000».

Наша Міністэрства энергетыкі далучылася да яе і на першым часе няблага ўдзельнічала ў ёй. У Жэневе пра беларускіх спецыялістаў я чуў добрыя водгукі. Супрацоўніцтва абяцала выхад Беларусі на ўкараненне выгадных энергазберагальных праектаў. Прадстаўнікі нашага міністэрства прыехалі ў Жэневу толькі на адно мерапрыемства, а на другое, трэцяе, чацвёртае — не. Не знайшлося валюты на камандзіроўку.

Тэлефануюць яны мне з Мінска, просяць напрамілы Бог заняцца іх пытаннем. Я ж прафесіянальны дыпламат, у энергетыцы поўны дылетант. Праўда, мне ўдалося адстаяць асобныя палітычныя моманты, але глыбока ўнікнуць у спецыфіку праблемы мне было не пад сілу.

Затраты нашых спецыялістаў на камандзіроўку ў параўнанні з эфектам, чакаемым ад рэалізацыі вышэйназваных праектаў, у прамым сэнсе слова былі б мікраскапічныя.

Але ёсць і станоўчыя прыклады. Плённа развіваецца ў нас супрацоўніцтва з Міжнароднай арганізацыяй працы, з якой ёсць шэраг вельмі цікавых праектаў па забеспячэнню занятасці ў Беларусі.

Паспяхова наладжваюцца сувязі ў пэнтэнтнага ведамства Беларусі з Сусветнай арганізацыяй інтэлектуальнай уласнасці. Яна, адкрыю невялікі сакрэт, адносна багатая арганізацыя. Наш узнос у яе невялікі, а бяром мы адтуль шмат.

— Але, Андрэй Алегавіч, можна назваць і шэраг важных для Беларусі міжнародных арганізацый, з якімі мы з цяжкасцю знаходзім узаемаразуменне, нярэдка разыходзімся ў падыходах, ацэнках, высновах. У дадзеным выпадку паказальныя адносіны з Сусветным банкам і Міжнародным валютным фондам. У чым тут справа?

— Наконт дзейнасці гэтых фінансавых устаноў існуюць два палярныя погляды. Адны лічаць рэцэпты МВФ вельмі карыснымі, другія непрымальнымі і шкодным для эканомікі Беларусі. Я не прымаю ні першы, ні другі бок. Напружанасць у нашы адносіны з фондам уносіць тое, што яго эксперты выходзяць з практыкі Захаду пры ацэнцы эканамічнай сітуацыі і рэкамендацыях па пераадоленню крызісу ў Беларусі. Не ўсе іх парады мы можам прыняць, бо на Захадзе ёсць выпрабаваная шматгадовай практыкай сістэма сацыяльнай абароны працоўнага чалавека, якая дазваляе яму больш-менш прыстойна перажыць не лепшую паласу жыцця.

У Беларусі сітуацыя іншая. Пераважная большасць насельніцтва не вытрымае поўнай адмены дзяржаўных датацый на жыллё, камунальныя паслугі, як гэтага патрабуе МВФ. Адсюль і непаразуменні. Але на тое і існуе перагаворны працэс, каб давесці свой пункт погляду. Мы неаднойчы паўтаралі і будзем далей растлумачваць нашу пазіцыю, бо Беларусь зацікаўлена ў супрацоўніцтве з фінансавымі арганізацыямі.

— У гады «халоднай вайны» савецкая прапаганда доўгі час сцвярджала, што ўсе міжнародныя арганізацыі знаходзяцца пад магутным уплывам амерыканцаў і з'яўляюцца зручным інструментам імперыялізму ЗША. Вайна тая скончылася. Што змянілася ў раскладцы сіл у буйных міжнародных арганізацыях? Трэба думаць, Барыс Ельцын не выпадкова ў час нядаўняга афіцыйнага візіту ў Пекін заявіў, што трэба пакончыць з сітуацыяй, калі адна краіна ў свеце вучыць усіх, як трэба жыць і працаваць, якую праводзіць знешнюю і ўнутраную палітыку, нават якія кадры вылучаць на высокія пасады. Расійскі прэзідэнт, безумоўна, меў на ўвазе ЗША.

— ...Нешта ёсць у вашых словах. Але сёння сітуацыя іншая і больш складаная. Пасля другой сусветнай вайны, калі была створана ААН, аднаўлялі сваю дзейнасць многія іншыя спецыялізаваныя міжнародныя арганізацыі, пачалося і вострае працістаянне Савецкага Саюза, яго паплечнікаў па сацлагеру і Захаду.

Часам даходзіла да кур'ёзаў. У Сусветную арганізацыю аховы здароўя мы ўступілі ў 1948 годзе. Потым праз некалькі гадоў па загаду «бацькі ўсіх народаў» Сталіна сталі так званымі пасіўнымі членамі разам з Украінай і СССР. І толькі ў 1991 годзе Беларусь аднавіла сваё членства ў гэтай арганізацыі.

Потым, у канцы 50—пачатку 60-х гадоў з развалам каланіяльнай сістэмы і імклівым выхадам на міжнародную арэну шматлікай групы новых незалежных дзяржаў, якія прынеслі з сабой шмат надзвычай вострых праблем, становішча ў свеце трохі змянілася. Нямала гэтых «навічкоў» падтрымліваў СССР, праўда, не заўсёды бескарысліва.

Сёння, калі ідэалогія больш не падзяляе народы, можна прывесці не адзін прыклад таго, як дзякуючы ўмеламу і разумнаму абгрунтаванню сваёй пазіцыі можна пераканаць нават былых ворагаў з капіталістычнага лагера ў аб'ектыўнасці сваёй пазіцыі.

Што датычыць Беларусі, то ёй нядаўна ўдалося дзякуючы лагічнаму растлумачванню ў ААН эканамічнай і сацыяльнай сітуацыі ў нашай краіне перайсці з групы «ві» ў групу «сі», што дазволіла нам у пяць разоў зменшыць (а гэта дзесяткі мільёнаў долараў) свой узнос на аперацыі па падтрыманню міру. Што, мушу заўважыць, было вельмі нявыгадна асноўным фінансавым донарам з ліку багатых развітых краін свету, як нявыгадна было і зменшэнне нашага ўзносу ў рэгулярны бюджэт. Аднак яны пайшлі на падобны крок, бо мы іх здолелі пераканаць у тым, што ранейшы ўзнос быў СССР значна завышаны па ідэалагічных прычынах. Тады, каб лепш выглядаць у вачах сусветнай супольнасці, наўмысна перабольшваўся рэальны даход на душу насельніцтва. Менавіта па гэтым паказчыку налічваецца ўзнос. Страшна нават сказаць, колькі мы пераплацілі лішняга за падтрымку іміджа СССР як краіны з моцнай і здаровай эканомікай.

На мой погляд, гэта была ідэалагічная авантура, за якую нам даводзіцца расплачвацца пасля развалу СССР. Справа ў тым, што дзякуючы ў ААН сістэма налічэння ўзносаў не дазваляе хутка пераглядаць раней прадстаўленую дзяржавамі статыстыку. Таму яшчэ і сёння там нашы эканамічныя паказчыкі вымяраюць па ранейшаму савецкаму нерэальнаму курсу долара да рубля, «дутых» лічбах развіцця эканомікі.

— З эканамічных міжнародных арганізацый да былых рэспублік СССР найбольш дрэнна ставілася КОКОМ, якая сачыла за экспартам у Савецкі Саюз сучасных тэхналогій і вырабаў, напрыклад, звышмагутных камп'ютэраў. Пасля абвяшчэння СНД паступова прыйшла ў заняпад і КОКОМ. На яе базе быццам бы ствараецца новая арганізацыя?

— Так, КОКОМ ужо не існуе, а новая арганізацыя яшчэ не пачала дзейнічаць. Летась у снежні дзяржавы — удзельніцы КОКОМ сустрэліся ў Галандыі і выпрацавалі так званыя Васэнаарскія дамоўленасці (ад назвы месца нарады гарадка Васэнаар), якія ўстанаўліваюць постКАКОМаўскі рэжым. У ім, між іншым, удзельнічае Расія.

Што датычыць Беларусі, то мы вельмі зацікаўлены ў супрацоўніцтве з гэтай будучай арганізацыяй і МЗС прыкладзе максімум намаганняў, каб стаць яе членам. Удзел у ёй адкрые нам доступ да новых тэхналогій, і практычна без абмежаванняў.

Калі раней КОКОМ была выключна дыскрымінацыйнай арганізацыяй і дзейнічала супраць сацыялістычных краін, то зараз яе пераемніца будзе процідзейнічаць прасоўванню перадавых тэхналогій толькі ў краіны, якія не выконваюць міжнародных абавязацельстваў па раззбраенню і нераспаўсюджванню зброі. Беларусь жа выконвае ўсе свае абавязацельствы і мае права прэтэндаваць на вельмі выгаднае членства ў гэтай элітнай арганізацыі развітых краін свету. Тады мы зможам яшчэ і свабодна гандляваць сваімі таварамі на іх рынках.

— Апошнім часам у свеце ўсё больш рашуча і аўтарытэтна гучыць голас няўрадавых арганізацый. Як з імі ў нас развіваюцца кантакты і чым можа быць карыснае падобнае супрацоўніцтва?

— Пытанне не зусім да мяне. Мы працуем толькі з арганізацыямі, якія створаны на аснове міжурадавых пагадненняў. Але ў сваёй рабоце ўлічваем і меркаванні няўрадавых грамадскіх структур.

Яны — з'ява вельмі цікавая, якая імкліва развіваецца. За мяжой яны ахопліваюць усе сферы дзейнасці чалавека, і супрацоўніцтва з імі трэба весці. Няўрадавыя арганізацыі, асабліва ў развітых краінах, адрозніваюцца глыбокім аналізам праблем. У ЗША, дарэчы, многія распрацоўкі гэтых арганізацый часта становяцца элементамі вялікай палітыкі. Вось гэтаму нам трэба вучыцца. Я, як адзін з кіраўнікоў МЗС, быў бы рады, калі б няўрадавыя арганізацыі Беларусі знаёмілі мяне са сваімі аналітычнымі дакладамі, запіскамі па розных праблемах палітыкі міжнароднага жыцця. На жаль, гэтага пакуль не назіраецца.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ТРЫБУНА ДЭПУТАТА

Уладзімір НІСЦЮК:

«НА СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ ВЯРХОЎНЫ САВЕТ ПРАЦУЕ ЯК ДРЭННА АДЛАДЖАНАЯ МАШЫНА»

Ва ўчарашнім нумары «Звязды» мы паведамілі аб намеры дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, намесніка старшыні Камісіі па правах чалавека, нацыянальных пытаннях, сродках масавай інфармацыі, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі Уладзіміра Нісцюка на адным з бліжэйшых пасяджэнняў парламента выступіць з прапановай унесці ў парадак дня пытанне аб адкліканні Старшыні Вярхоўнага Савета Сямёна Шарацкага. Вось якія матывы і аргументы такога рашэння прывёў Уладзімір Пятровіч спецыяльна для нашай газеты:

— Для ўнясення пытання ў парадак дня трэба, каб за яго прагаласавалі 2/3 дэпутатаў Вярхоўнага Савета. Ужо сёння ёсць шэраг прыхільнікаў майго намеру. Але я вельмі не хацеў бы, каб гэта падавалася кораткa, без каментарыя, паколькі пытанне вельмі няпростае...

Размова ідзе аб тым, што на сённяшні дзень Вярхоўны Савет у многім працуе як дрэнна адладжаная машына. Прычына простая: няма арганізуючага пачатку ў дзейнасці Прэзідыума і асабліва няма гэтага пачатку ў дзейнасці нашага паважанага Старшыні Вярхоўнага Савета. Вось сабраўся ён і паехаў на два тыдні разам з М. Гірцуем глядзець на амерыканскіх кароў... Палітычная сітуацыя ў рэспубліцы напаленая, у парламенце крайнія сілы сутыкаюцца лбамі, сацыяльныя выбухі наспяваюць, а Старшыня парламента паехаў турыстам паглядзець, як працуюць амерыканскія фермеры. Цяпер ён прыехаў, адзе ў Бішкек — на Міжпарламенцкую асамблею СНД, вернецца адтуль — ужо ляжыць запрашэнне ў Венгрыю на шэсць дзён. Слухайце: трэба ж камусьці кіраваць працэсам. Альбо арганізаваць працу і ездзіць, альбо аддаць гэта месца таму, хто хоча ў рэспубліцы працаваць. Не да смеху сёння: 15 мая Прэзідыумам Вярхоўнага Савета зацверджаны новы штат Сакратарыята, але людзі не атрымліваюць грошы, таму што Шарэцкі паехаў у Злучаныя Штаты і не падпісаў гэты дакумент. Як вам падабаюцца такія сітуацыі?! І новы штат сёння не працуе, людзі ходзяць і не ведаюць: будзе заўтра зарплата ці не будзе...

Быў зваротт фракцыі «Грамадзянскае дзеянне» да Вярхоўнага Савета з прапановай унесці ў парадак дня справаздачу Прэзідыума аб праводзімай рабоце, аднак ён застаўся па-за ўвагай. Няма сёння арганізацыйнага стрыжня і арганізуючага пачатку. Таму няма сёння і прынятнага разгляду ці распрацоўкі тых законаў, якія вырашалі б эканамічны лёс дзяржавы. Яшчэ ў самым пачатку сесіі ў парадак дня было ўнесена пытанне аб стварэнні спецыяльнай камісіі па выпрацоўцы асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі рэспублікі, аднак да гэтага часу справа замоўчваецца. Мы не займаемся галоўным, тым, для чаго выбаршчыкі накіравалі нас у Вярхоўны Савет: не вырашаем праблемы эканамічнага развіцця дзяржавы. Аб музеях і музейных фондах, аб трансплантацыі тканак і органаў чалавека — вельмі шмат пытанняў другараднага значэння разглядаем мы. Я лічу, што мы павінны працаваць над эканамічнымі пытаннямі, пытаннямі правоў чалавека — тымі, што датычацца рэалізацыі палажэнняў Канстытуцыі. І не трэба нідзе ездзіць і вучыцца ў амерыканцаў ці немцаў, мы рэальна ўсведамляем самі ўсё, што ў нас робіцца ў рэспубліцы. Вучыцца, відавочна, трэба будзе пазней, ды і рабіць гэта неабходна маладым палітыкам... А чаму вучыцца акадэміку, прафесару, доктару — нашаму спікеру?! Яму, відавочна, трэба кіраваць працэсам, для чаго мы яго і выбіралі. Мы ж не інкубатар для вырошчання будучых спікераў...

Двойчы накіроўваў я запыты Старшыні Вярхоўнага Савета — мне далі адпіскі. Не выконваецца рэгламент, прычым не толькі па працэдурных пытаннях. Ёсць у рэгламенце цэлы раздзел аб стварэнні кансультатыўнага савета з ліку дэпутатаў, якія працуюць на пастаяннай аснове. Аднак ніхто з намі не працуе. Ніякай інфармацыі мы не маем: што робіцца, як і дзе. Прэзідыум стаў машынай для зацвярджэння замежных камандзіровак. Хіба гэта справа?!

Гаспадара ў парламенце, адным словам, няма. Спікер хоча ў

Сядзіба

Выпуск № 337 Рубрыку вядзе Мікалай ЧАХОЎСКІ

АКАРАНЕННЕ І... РАЗМОВЫ

Я чула, што ў газеце «Звязда» была надрукавана заметка, у якой расказвалася, як у чэрвені са зрэзанай галінкі яблыні (грушы, іншых плодовых культур) выгадаваць дрэўца. Тую галінку апрацоўваць нейкім саставам суткі і садзіць. Яна пускае карані. Я шмат разоў спрабавала знайсці тую заметку і не змагла...

Н. К. Чухлей,
вёска Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна.

Мусім адразу супакоіць вас, Ніна Канстанцінаўна: такой заметкі не было. Гэта фантазія нашых чытачоў-садаводаў. На жаль, навука і практыка яшчэ не дасягнулі такіх вышынь, каб вось так проста гадаваць дрэўца. Зрэзаў, скажам, у Стоўбцах галінку добрага сорту, адвёз куды-небудзь далей, пасадзіў і здымай плады... Аб гэтым можна марыць і... гаварыць.

Але дыму без агню не бывае. Так і ў нашым выпадку. У раздзеле «Сядзіба» не адзін раз друкаваліся паведамленні-парады, як акараніць зялёныя чаранкі парэчкі, абляпіхі, ружы, некаторых іншых культур. Але не яблыні, грушы, вішні, слівы. Няма пакуль што такіх стымулятараў росту, каб прымусіць гэтыя галінкі даваць карані. Такія галінкі можна прышчапіць. Рабіць гэта вясною, калі дрэва «спіць». У час вегетацыі амаль адны няўдачы.

Якія ж неабходна стварыць умовы, каб чаранок абляпіхі ці ружы прыжыўся? Самае галоўнае — не даводзіць яго да абязводжвання. Далей наразаем з адзеравянелай часткі аловачкі-чаранкі. Яны з адным-двума лісцікамі. Ліст на трэць ці палову адрэзаць — будзе меншае выпарэнне вільгаці. У камлі пілкай з дробным зубам падрапаем кару. Гэта стымулюе коранеўтварэнне. Паставім у шклянку са слабым растворам попелу (сталовая лыжка на літр вады, настоена суткі, зліта з асадку). Зверху накрыем яшчэ адным слоікам ці цэлафанавым пакетам. Не трымаць на вельмі яркім святле (тым больш — на сонцы).

«Аловачкі» парэчак перад акараненнем.

Праз суткі ці двое чаранкі (чаранок) паставіць у спецыяльны порысты грунт. Можна выкарыстоўваць нават зямлю для расады. Толькі яе ўбясшкодзіць прапарваннем. Усе нашы пасадкі накрыць плёнкай. Павінен атрымацца міні-парнічок. Там цёпла і вельмі «мокра» (100-працэнтная вільготнасць). Паліваць пакаёвай вадой. Зрэдку абдаваць і абрызаныя палавінкі лісцікаў. Калі ўсё складваецца добра, праз месяц ці менш расліна пачынае сваё новае жыццё.

Парэчку можна акараняць на кусце. Для гэтага на галінку прыладжваем зямлю ў цэлафане. Сочым, каб яна ўвесь час была вільготная. Вядома, сама галінка ў месцы прыладжвання зямлі павінна быць падрапана.

Калі ў вас загінула карлікавае дрэўца яблыні, а знізу (амаль з зямлі, ніжэй прышчэпкі) пайшлі новыя парасткі, іх можна акараніць. Для гэтага прыгнуць да зямлі, прымацаваць рагаткамі, акучыць. Увесь час паліваць.

Найлепшы стымулятар росту раслін — гетараўксін. Знайсці яго няпроста. Дапамагае нікаўнавая кіслата — некалькі кропель на літр вады. Садаводы з поспехам прымяняюць настой попелу з бураксам (на літр вады лыжку прасеянага попелу і 1-2 г бураксу ці борнай кіслаты). Яшчэ падыходзіць сок алоэ, нават сок бульбы.

НЕ ПРАГАДАЛІ!

У нашай пошце нямала пісьмаў, у якіх людзі дзякуюць за газету «Для вас» («Ураджайныя градкі»). Адной жанчыне падарылі выпуск № 16 «Сеем!». Брашура вельмі спадабалася: у час сяўбы выкарыстоўвала нашы рэкамендацыі. Прыслала пісьмо, каб набыць астатнія.

Па традыцыі ў канцы месяца аддзел «Сядзіба» выпускае чарговыя выданні. Адначасова з гэтым выпускам «Сядзібы» выходзяць і «Ураджайныя градкі» № 20. Яны прысвечаны хваробам і шкоднікам садовых і агародных культур. Газета-брашура неадкладна паступае да падпісчыкаў, яе можна набыць таксама ў кіёсках «Саюздруку» гарадоў і раённых цэнтраў. Толькі абавязкова пытаць выданне ў кіяскёраў, бо яны звычайна так «схаваюць», што і самі знайсці не могуць.

Некалькі дзён засталося на рэалізацыю кніжачкі «Дары саду» (№19). Паспяшайцеся да тых жа кіёскаў.

Усе папярэднія выпускі — пра сяўбу і нітраты, угнаенні, насенняводства, як атрымаць тону памідораў з соткі, замежныя тэхналогіі — можна заказаць у рэдакцыі (выпускі №№ 15—19). Хто жадае мець іх у сваёй бібліятэчцы, з любога паштовага аддзялення пералічвае грошы на разліковы рахунак газеты «Звязда» ў АКБ «Белбізнесбанк». Цана аднаго экземпляра — 4000 руб., двух і болей — па 3,5 тысячы рублёў. Розніца выклікана коштам заказных адпраўленняў.

На пераводзе ўкажыце: адрас рэдакцыі з індэксам **(220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда»)** і паметку аб пералічэнні грошай **(наш разліковы рахунак 3012210270016, код 739 у АКБ «Белбізнесбанк»)**, укажыце, якія брашуры жадаеце набыць, іх нумары. Як толькі атрымаем пераводы, вам будуць высланы выданні. Не забудзьце разборліва напісаць свой адрас з індэксам, прозвішча, імя і імя па бацьку.

Дзе можна набыць нашы выданні? У абласцях гэтага зрабіць нельга. У Мінску брашуркі для дачнікаў ёсць у магазінах «Насенне», «Сельгаскніга» (праспл. Скарыны), «Аграхімік» (вул. Чырванаазорная, 8). Цэны тут самыя нізкія — адзін экземпляр каштуе 3000 руб.

ДАПАМОГУЦЬ «АКСІХОМ-80» І «ТАПАЗ»

У сырое надвор'е вельмі актывізаваліся хваробы грыбковага паходжання. Дачнікі пайшлі ў крамы. Мінскі магазін «Аграхімік», які абслугоўвае «Белсельгасхімія», прапануе некалькі фунгіцыдаў. Адзін з іх — «аксіхом-80». Гэта таблеткі (можа быць і парашок). На 10 літраў вады патрэбны дзве таблеткі, ці 20 г парашку. Добра развесці, прафільтраваць. Працаваць са свежым растворам. Раўнамерна намочваць усё лісце. Дзейнічае супраць фітафтарозу, макраспарозу, мучністай расы. Апрацоўваць да трох разоў і не пазней чым за 20 дзён да збору ўраджаю.

Супраць мучністай расы і ржы дзейнічае яшчэ адзін фунгіцыд — «тапаз», выраблены ў Расіі з дапамогай швейцарскай фірмы «Сіба». Ампулу развесці ў 8 ці 10 літрах вады. Для парэчак і агрэсту (мучністая раса) браць максімальную колькасць вады — 10 літраў, для агуркоў закрытага і адкрытага грунту — 8 літраў. Прэпарат малатаксічны для чалавека і жывёл. Усё ж не карыстацца посудам, які пасля будзе прыменены ў хатніх умовах. Парэчкі і агрэст апрацоўваць да чатырох разоў, агуркі — тры разы. Апошняя апрацоўка — за 20—30 дзён да збору ўраджаю.

У час апрацоўкі раслін на тварах людзей павінны быць марлевыя павязкі. Калі растворы трапілі на адкрытыя ўчасткі скуры, абавязкова прамыць цёплай вадой з мылам. Вядома, у час работы не курыць, не есці.

УНІВЕРСАЛЬНАЯ АКТЫНІДЫЯ

На пачатку дзевяностых гадоў вельмі падняўся аўтарытэт актынідыі. Як і абляпіха, гэта расліна прыйшла з Далёкага Усходу. Там яна ўецца па дрэвах і кустах, утвараючы цяжкапераадольныя «джунглі». Плады даюць сарты «каламікта» і «аргута». Культура двухдомная. Для апылення трэба высаджваць мужчынскія экземпляры.

Ягады зеленавата-белаватага колеру, выцягнутыя, як цыліндрыкі, вага іх 2—5 г, вельмі пахучыя (бы ананасы). Найбольшая каштоўнасць — вітамін С.

Куст-ліяна пярэсты. Лісце тоненькае і рознай афарбоўкі. Перад цвіценнем на верхавінцы з'яўляюцца белыя плямы. Яны павялічваюцца і могуць ахапіць увесь лісточак. Затым колер мяняецца на чырвона-малінавы. Гэтыя змены найбольш бачныя на мужчынскіх экземплярах — быццам прываблiваюць жаночыя.

Культура вельмі прызвычаена да розных глебаў. Перад пасадкай абавязковыя ямы-кубы 50х50 ці 60х60 см. На дне — дрэнаж, далей — перагнойная зямля ўперамешку з угнаеннямі. На яму ўнесці: вядро перапрэлага гною, да 150 г суперфасфату і амаль столькі ж калійных угнаенняў. Азотных — толькі след: да 25 г салетры ці сульфату амонію. Усе арганічныя і мінеральныя ўгнаенні старанна перамяшаць з глебай. Адлегласць адной расліны ад другой — да 1,5—2 м. На тры жаночыя кусты — адзін мужчынскі.

Калі кусты-ліяны выцягнуцца, абавязковыя надзейныя апоры. Глебу пад раслінамі рыхліць, мульчыраваць торфам, гноем, пілавіннем. Да каранёвай шыйкі падсыпаць зямлю двойчы за сезон — вясною і летам. Расліна можа «паднімацца», агаляючы карані. На дарослы экземпляр уносіць: па 15 г суперфасфату і калію і да 20 г салетры. Усё — на адзін квадратны метр. Выдатна дзейнічае попел — паўвядра на дарослае дрэва. Уносіць у два прыёмы — большую дозу вясною, астатнюю — летам.

Увогуле на дарослы куст трэба даваць да 400—450 г азотных, 140 г фасфатных і калійных, 80 г магніевых угнаенняў.

Расліну (асабліва ў маладым узросце) любяць «пашчыпаць» каты. Часта яе накрываюць сеткамі. Хваробамі актынідыя паражаецца вельмі нязначна.

ЦІХАЯ ІНДЫЧКА З ВЫСОКАЙ ПРЫВАГАЙ

Апошнім часам заўважана цікавасць да розных птушак. На дачах растуць куры, гусі, качкі. Вядома, і індычкі. Яшчэ б, за дета кожная, як кажуць, галава набывае вагу да шасці—васьмі кілаграмаў! Мяса для сям'і на два тыдні.

У адрозненне ад іншых свойскіх птушак, індычка патрабуе прасторнага памяшкання з вокнамі і надзейнай вентыляцыяй (на галаву — не менш аднаго кв. метра). Птушка вельмі пакутуе ад скразнякоў, рэзкіх перападаў тэмператур. Падлога — абавязкова сухая. Гной убіраць як мага часцей — раз у два-тры дні, памяшканне засцілаць амаль сухой тарфакрошкай. Надзвычай непажаданыя вуглекіслата і аміяк. Яны могуць атручваць «жыхароў».

У хлеўчуку карытцаў для кармлення столькі, каб ніхто не ваяваў за сваё месца. Прасторная і паілка, дзе заўжды свежая вада (мяняць двойчы на суткі).

Самае цёплае і спакойнае месца адводзіцца для седала. Даўжыня яго адвольная. Вышыня — 45—50 см ад падлогі. Астатняе абсталяванне як і для курэй. Толькі больш трывалае, бо самі птушкі цяжэйшыя. Вельмі дарэчы будуць пад седаламі выцяжныя скрынкі — спатрэбіцца менш часу для ўборкі. Выняў такое прыстасаванне і аднёс яго змесціва ў адведзенае месца.

У халодны перыяд (часта і вясною) індычкі пакутуюць ад авітамінозу. Таму як мага раней выпускаць на волю. І наогул выгул на працягу ўсяго дня. Птушка знойдзе ўсё неабходнае. А калі гэта немагчыма, то даваць зялёную траву, крапіву, лісце капусты — усё, ад чаго індычка не адварочваецца.

У любым выпадку абавязковыя так званыя «санітарныя дні». Некалькі птушак ці ўвесь статак перавесці ў іншае месца. У памяшканні навесці генеральны парадак. Літаральна ўсё — дошкі на седалах, вокны, сцены, падлогу, розны інвентар мыюць гарачай вадой з каўстычнай содай. Можна пабяліць ці абнавіць пабелку. Абавязкова замяніць падсцілку. На сценах, ля седалаў і ў месцы, дзе нясуцца індычкі, прывязаць палын — будзе менш паразітаў. Каб птушкі праводзілі індывідуальную штодзённую санапрацоўку, ставяць скрынкі з пяском і попелам, рознай пацярухай.

БАЛАДА ПРА СЛАЎНЫХ РЫЦАРАЎ «КАМЭЛОТА»

Гэта гісторыя пачалася вельмі даўно, калі на зямлі будавалі прыгожыя замкі, а іх насялялі высакародныя гаспадары. Кожны замак меў сваю рыцарскую дружыну, а ў кожнага рыцаря была свая дама сэрца. Так, былі і тыя, хто пакідаў спакойнае жыццё і вандраваў па свеце, робячы добрыя справы ў гонар сваёй дамы сэрца. Каб схавацца ад непагадзі ды і проста адпачыць ад подзвігаў, рыцары прыспешвалі сваіх коней да камэлота — палаца, у якім чакалі высакародных вандроўнікаў.

ДЫК ВОСЬ, у адзін з такіх замкаў запрашаем і мы. Так, былі рыцарскія камэлоты ў старажытнай Літве, як тады называўся наш край. І аднойчы пад адным дахам сабраліся чатыры маладыя хлапцы: Змітро Сідаровіч, Ігар Войніч, Алесь Кішкін, Анатоль Басай.

Выпадкова ці не яны сышліся разам — якая розніца? Проста іх звяла разам дарога. А каб адна з дарог, што праляглі па Беларусі не здавалася надта доўгай і цяжкай, сама сабою прыйшла ў галаву песня:

Карчомка за спіной і два кілішкі ў ёй
Нядужа танныя, нядужа танныя.
Мы звесялелі ўраз і гэтак добра,
Што ёсць у нас Краіна Талераў,
Краіна Талераў, Краіна Талераў.

І вырашылі яны далей вандраваць разам па амаль казачнай «Краіне Талераў». Краіна гэта зусім рэальная, нават для тых, хто не надта любіць падарожнічаць, але сумуе па нармальных адносінах паміж людзьмі. Дастаткова ўзяць першы альбом, запісаны гуртом «Камэлот», які так і называецца: «У Краіне Талераў».

І ўсё адразу мяняецца.

Ажывае Беларусь. Яна ізноў такая, як у старажытнасці. У ёй жывуць людзі, для якіх асабісты дабрабыт вызначаецца духам свабоды, славаю, багаццем сваёй зямлі. Гэта той час, калі дзяржаву гатовы былі бараніць па першаму поклічу рыцарскія атрады.

Там дзе змога — перамога,
Там дзе песня — шанцу многа,
Ды спакой мудрэй за бойку,
Грай, дудар, тут дадам!

Кірунак творчасці этна-фольк-гурта — рыцарскія і жаўнерскія песні, песні беларускіх вагантаў і менестраляў, музыка еўрапейскага сярэднявечча. А пачынаецца ён са спробы разгледзець беларускую культуру ў агульнаеўрапейскім кантэксце, прадставіць яе не толькі як сялянскую, але і як культуру беларускіх гарадоў мінулага. Стыль — сінтэз акустычнага рока, лютневай гатычнай і барочнай музыкі, фальклору Вялікага княства Літоўскага, а таксама краін Паўночнай і Заходняй Еўропы.

Ды ўсе гэтыя мудрагелістыя словы — толькі для спецыялістаў. А любы чалавек можа адкрыць у «Камэлоце» проста прыемныя для душы песні. Прытым на любы выпадак жыцця: вам не падабаецца недасканаласць навокал — паслухайце новы альбом; не можаце мірыцца з жорсткасцю прыдуманых людзьмі законаў — шукайце паратунку ў «Краіне Талераў»; не ведаеце, як прызнацца ў каханні — камэлотаўскія песні вам дапамогуць. А калі вы проста сумуеце па мілагучнай, узнёслай беларускай музыцы — вам проста не жыць без гэтага альбома. Тым больш, што не так часта апошнім часам нашы артысты балуюць песнямі на роднай мове. Дарэчы, аўтарка гэтых радкоў ўсе непрыемнасці мінулага дня ўвечары гасіць музыкай гурта. Проста падабаецца, і ўсё.

Каму з чатырох нашых сучаснікаў прыйшло ў галаву першаму звярнуцца да рыцарскіх песень, цяпер высвятляць не мае сэнсу. Вядома толькі, што пачынаўся гурт «Камэлот» у 1991 годзе з доўгіх размоў памёж Змітрам Сідаровічам і Алесем Кішкіным, якія ўжо даўно сябравалі, але не думалі пра агульную справу. Аднойчы барда Сідаровіча запрасілі на адкрыццё беларускага гуманітарнага ліцэя. Нецікава было выступаць толькі пад гітару, і Змітро прапанаваў далучыцца Кішкіну, ды паклікаў У.Бярберава са сваёй дудой. З канцэрта іх ледзь не вынеслі на руках — вельмі ж ужо ўспадабалася. Але гэта было яшчэ далёка не тое... Спачатку была прапанова назваць гурт «Дубовыя лютні» — бо гралі на вельмі дрэнных гітарах, зробленых на Барысаўскай мэблевай фабрыцы. Прыходзілі яшчэ людзі ў гурт — і сыходзілі. Удзельнікі праекта давалі аб'явы: шукаем кларнетыста, габаіста і гэтак далей. Цяжка зараз знайсці музыкаў, якія былі б згодны працаваць толькі дзеля ідэі. Неяк Змітро ў падземным пераходзе пачуў флейту. «Добра граеш,»—пакі, — будзе праўда. Пры тым не дзеля таго яны прыйшлі ў творчасць, каб паездзіць па канцэртах ды стаць вядомымі. Кожны з іх апроч музыкі займаецца сваімі справамі, у кожнага ёсць работа, каб забяспечваць сям'ю, а гэта дышоў да хлапца, расказаў яму пра праект «Камэлота». Той зацікавіўся. А потым паехаў у Германію — павучыцца. Вернецца не вернецца, хто яго ведае?.. Неўзабаве дайшлі да «Камэлота» у цяперашнім яго выглядзе.

— Музыка, як вядома, — касмапалітычнае мастацтва, — тлумачыць выбраны накірунак Змітро Сідаровіч. — Але ёсць розныя гурты, якія абапіраюцца на тое сваё, што існуе ў кожнай зямлі. Мы не імкнёмся заваёўваць свет. У рэшце рэшт, навошта увогуле заваёўваць? Атрымалася так, што змест альбома мае дачыненне да вайсковай гісторыі, але мы не заклікаем да ваяўнічасці. Проста, гісторыя ёсць гісторыя, мы ж сродкамі музыкі спрабуем мадэляваць пэўнае стаўленне да яе, як Каратквін гэта рабіў сродкамі літаратуры.

Гісторыя працягваецца. Хіба ў нашым жыцці меней спраў для сапраўдных рыцараў? «Сёння жыццё аздабляе жолуд горкі, як дым»,— сцвярджае гурт у сваёй песні. З прагорклым лаветрам «камэлотаўцы» змагаюцца сваімі сродкамі. Яны пішуць песні. І калі сказаць, што тут сабраліся кампазітары, а не выканаўцы, гітарысты, флейтысты ці аранжыроўшчыкі, — будзе праўда. Пры тым не дзеля таго яны прыйшлі ў творчасць, каб паездзіць па канцэртах ды стаць вядомымі. Кожны з іх апроч музыкі займаецца сваімі справамі, у кожнага ёсць работа, каб забяспечваць сям'ю, а гэта таксама рыцарства ў нашы дні. Гурт аматарскі, прафесіянальных музыкаў тут няма ў сэнсе «жыцця з музыкі». Ды і ўвогуле зараз на Беларусі творчасць не прыносіць прыбытку. У вольны час яны збіраюцца, запісваюць думкі. Калі нехта вядзе дзённік на паперы, то яны занатоўваюць уражанні на магнітнай стужцы. Так паступова накопліваецца матэрыял на альбом.

Праўда, апошнім часам ім збірацца даводзіцца не надта часта. Так многа ветракоў параскідана на Беларусі, з якімі даводзіцца змагацца нам усім штодня. Пакуль з кожным разбярэшся, каб пазбавіць сваіх блізкіх ад залішніх клопатаў пра хлеб надзённы, — дзень ставіць апошнюю кропку. Прафесіянальнае рыцарства адбірае вельмі шмат часу. Толькі дама сэрца пакорліва чакае, калі ўсё ж такі загучыць у яе гонар вячэрняя серэнада:

Недалёка да світання,
Толькі не заснуць цяпер.
Ах, прадмет маіх ўздыхання,
Дай дабранач ты майму сэрцу!

Дамы сэрцаў упэўнены, што іх абраннікі — самыя таленавітыя. Часцей за ўсё ім і прыходзіцца быць самымі суровымі суддзямі. І самымі ўдзячнымі слухачамі. Хто яшчэ можа пачуць жывы «Камэлот»?

— Раней мы таксама выступалі і на канцэртах, — працягвае размову Змітро Сідаровіч. — Іншыя гурты так і існуюць. Ім цікава бачыць аддачу залы, пачуць воплескі, стаць вядомымі. Мы вырашылі, што гэта не тое, да чаго мы імкнёмся. І перайшлі ў разрад студыйных гуртоў. Гэта сусветная практыка, нічога заганнага тут няма, справа толькі ў тым, што ў рэшце рэшт атрымліваецца. Мы можам раз у год збірацца і запісваць нейкі праект. Інструменты — свае, усё што ёсць — прагучала. Можна яшчэ ўзяць на кухні некалькі місак-рандэльчыкаў, яшчэ штосці прыстасаваць, і ўжо нешта новае атрымаецца. Вядома, можа вялікая аўдыторыя нас і не ведае, затое ведае пэўнае кола людзей, якія пільна сочаць за навінкамі беларускай рок-музыкі. Мне нават падабаецца, што ёсць налёт андэграўндасці ў нашым існаванні, ёсць рамантыка.

«Камэлотаўская» рамантыка вельмі вытанчаная. Падабенства яе да рамантыкі колішняга пецярбургскага «Акварыума» Змітро Сідаровіч называе наканаванасцю лёсу. Падабенства гуртоў — выпадковае. У Пецярбургу была свая рок-тусоўка, тут — свая. А музыка заўсёды нараджаецца ў паветры, трэба толькі яе своечасова ўхапіць. Хто першы вынес яе на шырокую аўдыторыю — той і на кані. Тым больш, што сумуюць душы па рамантыцы.

— Падчас выступленняў на канцэртах, фестывалях мы сябе запісвалі, потым слухалі і дзівіліся: зусім не тое, што хацелася б чуць. Альбом, запісаны на студыі «Камэлот», — на 80 працэнтаў тое, што было задумана. І зараз музыка нікуды не падзелася, хоць трохі адсунулася на другі план з-за працы. Пісалі музыку да кінафільмаў. Будзеце глядзець мастацкі фільм «Шукальнікі скарбаў» І.Волах, ці дакументальны «Беларусь, лета 1991» У.Коласа, звярніце ўвагу на музычнае афармленне. Ёсць наш уклад у спектакль «Заложніца кахання» тэатра «Вольная сцэна». Ёсць музычны матэрыял яшчэ на адзін альбом. Можа нават зробім канцэртную праграму. Мы рухаемся. Марудна? Толькі на дрэнныя рэчы патрэбна мала часу і роздуму. Калі што ёсць добрае, то трэба яго ўдасканальваць. Бывае, што на тэта ідуць гады, але яны даюць свой плён. Мы яшчэ нагадаем пра сябе.

Толькі не знікае,
Будзе ў сэрцы
Гэта песня.
Наша зорка зноў заззяе,
Наша сонца ўваскрэсне.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЗНОЙДЗЕНЫ РАТУНАК АД МАШКАРЫ

Як ужо паведамляла чытачам «Звязда», апошнім часам у шэрагу рэгіёнаў краіны (Брэсцкая, Гомельская і Мінская вобласці) адзначалася нашэсце машкары, ад якой найперш (нават з выпадкамі гібелі) цярпела буйная рагатая жывёла. Як стала вядома рэдакцыі, нягледзячы на тое, што ў першых двух абласцях сітуацыя пакрысе паляпшаецца, падстаў для заспакаення гэта не дае: паводле апошніх даных Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, толькі ў Мінскай вобласці ў трох найбольш пацярпеўшых раёнах — Барысаўскім, Лагойскім і Чэрвеньскім — «атакі» машкары зведалі больш як 20 гаспадарак. Агульная колькасць захварэўшых тут жывёл дасягнула: у грамадскім сектары — каля 10 тысяч галоў, у прыватным — больш за 3 тысячы. Ад укусаў машкары адзначаўся падзеж каля 100 кароў, цялушак, бычкоў, з якіх большая частка прыладае на прыватны сектар. У гаспадарках, да таго ж, было вымушана забіта яшчэ 10 галоў жывёлы.

З просьбай даць каментарый сітуацыі, а таксама расказаць, што ж сабой уяўляе гэта машкара і як ад яе ратавацца, карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да начальніка процізпізатычнага і лячэбна-прафілактычнага ўпраўлення Мінсельгасхарчу Мікалая Савіцкага.

— Нашэсце машкары (а дакладная навуковая яе назва — калумбацкая мошка) адзначалася на Беларусі і раней, праўда тады яна назіралася практычна толькі на Палессі — у паўднёвых раёнах Гомельскай (Жыткавіцкі, Петрыкаўскі) і Брэсцкай (Столінскі) абласцей, — гаворыць Мікалай Васільевіч. — «Сёлета ж машкара «паднялася» да больш лаўночных раёнаў. Прычына тут толькі адна — гэтаму спрыяла цёплае і вільготнае надвор'е.

Як правіла, машкара нападае на буйную рагатую жывёлу на пашавых угоддзях раніцай ці вечарам, або нават у сонечны, але бяседраны поўдзень. У выніку ўкусаў у жывёлы ўзнікае сімулідатаксікоз — хвароба, звязаная з ацёкам лёгкіх, агульнай млявасцю. Дарэчы, па спосабу дзеяння яд машкары, які трапляе ў арганізм жывёлы са слінай, нагадвае пчаліны. Небяспеку выклікае таксама вялікае скапленне машкары ў паветры, паколькі яна можа літаральна «забіць» сваёй масай дыхальныя шляхі і жывёла рызыкуе загінуць ад удушша.

Як змагацца з гэтай навалай? Ёсць вельмі надзейны і эфектыўны прэпарат, які называецца «пратэідам». Дарэчы, яго вытворчасцю займаецца ледзь не адзіны ў свеце завод недзе ў Паўднёвай Афрыцы. Гэта экалагічна чыстае рэчыва, якое прыгатавана на аснове лекавых раслін. У нашай краіне яго можна набыць толькі ў адным месцы — у мінскай фірме «Кінс», якая завезла яго для патрэб гаспадарак і прыватных уладальнікаў рагуль у колькасці крыху больш за 2 тоны. Спосаб прымянення «пратэіду»: распыленне змешанага з вадой рэчыва на жывёлу. Такая ахова надзейна засцерагае апрацаваны статак на працягу 42—56 дзён. Дарэчы, кошт гэтай працэдуры складае ўсяго 2,5 — 3,5 тыс. рублёў за адну ўмоўную галаву буйной рагатай жывёлы. Гэта акалічнасць спрыяе таму, што ўжо 15 пацярпеўшых ад нашэсця машкары раёнаў закупілі прэпарат. Напрыклад, у Лагойскім раёне людзі вёскамі збіраюць грошы і едуць у Мінск набываць Пратэід. Улічваючы такое становішча, «Звязда» змяшчае тэлефон фірмы «Кінс», дзе можна набыць гэтыя лекі: 68-54-34. (Зазначым, што прэпарата засталося прыкладна каля тоны, таму раім кіраўнікам гаспадарак паспяшацца з яго набыццём. Кошт адной каністры (5 літраў) складае 2 млн. 480 тыс. беларускіх рублёў. Адзін літр рэчыва разводзяць у 1 тоне вады, на адну жывёлу ідзе 5 літраў раствору.) Мае вялікае значэнне, што прэпарат бясшкодны для чалавека. Так, калі раніцай апрацаваць статак «пратэідам», то ўжо праз 6 гадзін малако можна ўжываць у ежу.

Дарэчы, фірма «Кінс» не спынілася на дасягнутым. Ёю ўжо завезены ў краіну спецыяльныя прыстасаванні «Флектрон» на вушы жывёл, прынцып дзеяння якіх нагадвае індывідуальную «міні-лабараторыю» па адпуджванню машкары. Калі жывёла пацее, прыстасаванне выдзяляе ахоўнае рэчыва, якое бярэ яе нібы ў абалонку. Тэрмін дзеяння такой біркі — 4 месяцы, кошт адной складае каля трох долараў ЗША.

Па словах Мікалая Савіцкага, прымяненне абодвух прэпаратаў значна павышае прадуктыўнасць статка, засцерагае яго ад захворванняў. Ён дзейнічае не толькі на калумбацкую мошку, але і на іншую машкару, якой хапае на працягу лета. Таму спецыялісты вельмі раяць кіраўнікам гаспадарак і прыватным уладальнікам рагуль набываць гэтыя лячэбныя прэпараты.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КРЫМІНАЛ

ПОЛЬСКІ НАЁМНІК НАРВАЎСЯ НА БЕЛАРУСКІХ ПАГРАНІЧНІКАЎ

Пры пераходзе польска-беларускага ўчастка дзяржаўнай граніцы беларускімі пагранічнікамі быў затрыманы 16-гадовы вучань ПТВ з польскага гарадка Гродзіск-Мазавецкі, які меў намер стаць наёмнікам у Чачні. Пагранвойскі нашай рэспублікі з няўдалым «салдатам удачы» доўга не цырымоніліся і выдалі яго польскім уладам.

Не выключана, што на пошукі крывавай рамантыкі гора-наёмніка штурхнулі не столькі двойкі ў ПТВ, якіх у яго дастаткова, колькі прапаганда польскіх сродкаў масавай інфармацыі, у якіх дудаеўцы паказаны, як «высакародныя і бравыя барацьбіты з рускім імперыялізмам за нацыянальнае вызваленне».

Аднак мясцовыя законы строга забараняюць ваенную службу за межамі Айчыны, і ўлады памятаюць пра гэта. Пацвярджэнне таго — нядаўнія строгія прыгаворы, вынесеныя польскаму грамадзяніну, які служыў у замежным легіёне ў Францыі, і вярбоўшчыку з Кракава, які наймаў маладых людзей «на гарматнае мяса» ў Боснію.

Што ж датычыць 16-гадовага Яцака Б., то яму пакуль пашанцавала, і пад суд ён не трапіў, хоць бацькоўскай дзягі яму, відаць, не мінуць. Атрымліваючы наследніка з рук у рукі ад пагранічнікаў, бацька «чачэнскага вызваліцеля» пакляўся «выбіць з яго ўсю воінскую доблесць».

БЕЛТА.

«ТЫ МЯНЕ НАРАДЗІЛА, Я ЦЯБЕ ЗАБ'Ю»

Магіляўчане ў шоку: няўжо, як і ў Бабруйску, у горадзе з'явіўся людаед? Думаць так прымусіла паведамленне міліцыі аб тым, што пад лесвічнай пляцоўкай бальніцы аб'яднання «Хімвалакно», якая будуецца, вартаўнік знайшоў поліэтыленавы мяшок з тазавай часткай жанчыны.

Маньяк, аднак, тут ні пры чым. Як устанавілі супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС (злачынства было раскрыта за тры дні), пасварыліся маці і дачка. Апошняя схапіла нож, нанесла старой некалькі ўдараў, а затым нерухомае цела раздзяліла на 17 частак, якія схавала ў розных месцах.

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

БЯРЫ АПАРАТУРУ, ЦЯГНІ ДАМОЎ

Спрацаваўшая а палове дзевятай вечара ахоўная сігналізацыя ў цэнтральным універмагу Магілёва, здавалася, была несапраўднай: прыбыўшы нарад міліцыі пры вонкавым аглядзе вітрын і дзвярэй ніякіх пашкоджанняў не выявіў. Тым не менш, вырашылі выклікаць адміністрацыю магазіна. А ў 20.50 сігналізацыя спрацавала зноў.

Універмаг быў адкрыты прыбыўшымі прадаўцамі і міліцыя пасля стараннага агляду будынка знайшла на першым паверсе ў аддзеле харчовых тавараў двух падлеткаў, 1980 і 1981 года нараджэння, якія схаваліся пад прылаўкам. Побач былі знойдзены тры напакаваныя імі сумкі з апаратурай і іншымі таварамі. Яшчэ адна сумка была знойдзена на другім паверсе каля секцыі імпартнай відэаапаратуры. Агульная сума складзеных у баулы рэчаў «пацягнула» прыкладна на 50 млн. рублёў.

Як высветлілася ў далейшым, падлеткі перад закрыццём універмага схаваліся ў будынку за рамонтнымі шчытамі. Калі пайшлі апошнія прадаўцы, падлеткі прыняліся напаўняць таварамі прынесеныя сумкі. Абодва затрыманы, вядзецца следства.

Віктар КУПРЭЕЎ,
прэс-група УУС Магілёва.

ТЭЛЕБАЧАННЕ, Серада, 29 мая

Беларускае тэлебачанне

10.20 «Кобра». Тэлесерыял.
11.10 «Экамір-96». «Стварэнне» (Германія), «Эка-чалавек і...» (Польшча), «Кліпы па пытаннях аховы прыроды» (Польшча).
11.20 «Апошняе лета дзяцінства». Трохсерыйны мастацкі фільм. 1-я серыя.
12.25 «Зорная ростань».
13.05 Відэльма-нявідзьма.
15.00 Навіны.
15.15 «Фліпер». Тэлесерыял для дзяцей.
15.40 «Калейдаскоп сустрэч». Беларускія школьнікі ў Чэхіі.
16.30 Педагагічны экран. Вынікі навучальнага года.
17.00 Крада.
17.20 Госці ў хату. Дзеці — будучыня Зямлі.
17.50 Музычны антракт.
18.00 «Ты супакой мяне». Дак. фільм.
18.10 «Чым багаты...» Вытворчае аб'яднанне «Гомсельмаш».
18.25 Эканамікст.
18.35 «Тройны па аднаму». Музычная перадача MTV.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.00 «Кобра». Тэлесерыял.
19.55 «Хто гэта?» Тэлегульня.
20.05 Супергол.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 «Закон Бэрка». 11-я серыя.
23.10 Дзённік V Міжнароднага кінафестывалю «Залаты Віцязь».
23.40 Каралеўскае паляванне.
0.20 Навіны.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.30 Навіны.
8.15 «Сакрэт трапіканкі».
9.05 Тэма.
9.45 У свеце жывёл.
10.30 «Адгадай мелодыю».
11.10 У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». «Кантакт — дзелавое супрацоўніцтва краін Садружнасці».
14.20 «Зорны каўчег».
14.35 «Прыгоды капітана Урунгеля».
14.45 Кактус і К.
14.55 До-мі-соль.
15.10 Покліч джунгляў.
15.40 «Элен і хлопцы».
16.05 Тэт-а-тэт.
16.30 Сем дзён спорту.
17.20 «Сакрэт трапіканкі».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мелодыю».
19.00 «Няспешна і падрабязна...»
19.45 «Добрай ночы, малышы!»
20.00 Час.
20.40 Праграма перадач.
20.45 «Прэзідэнцкія выбары-96».
20.55 Фільм Леаніда Філатава «Сукіны дзеці».
22.45 Мужчына і жанчына.
23.45 «Дуброўскі». 2-я серыя.
0.50 Музычная праграма MTV.

Канал «Расія»

6.45, 7.50, 14.50, 19.35, 21.10, 23.40 Выбары-96.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00, 23.25 Весткі.
7.20 У гэты дзень...
7.30 Дзелавая Расія.
8.05 Імперыя гульняў. «На вадзе, на зямлі і ў паветры».
9.00 Кліп-антракт. В. Лявонцьеў.
9.10--10.20 «Санта-Барбара». **13.50** «Загнаныя паляўнічыя». Мультфільм.
14.00 Іваноў, Пятроў,